КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 15 (191)
◂ 23 КРАСАВІКА ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час



АЛЕСЬ ЗАРЭМБЮК

Стар. 5

**ХТО АСУШЫЎ ЭЛЕКТАРАЛЬНАЕ «БАЛОТА»?**

Структура беларускага грамадства з'яўляецца рамкай, якая абмяжоўвае электаральныя фантазіі прэтэндэнтаў на прэзідэнцкую пасаду

Стар. 4

**БРЫТАНСКІ АБАМА**

Праз 80 гадоў перапынку брытанскія лібералы блізкія да таго, каб зноў увайсці ва ўрад

Стар. 12

**СЕМ ЦНОТАЎ БГ**

Стар. 14–15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ЖАНЧЫНЫ ЯНУША РАДЗІВІЛА**

Нарыс Аляксея Хадыкі з цыклу «Таямніцы гісторыі»

▸ РОЗДУМ

# ДВА КАТАРСІСЫ

*Алег НОВІКАЎ*

**Польшча і Беларусь перажываюць этап станаўлення новых палітычных культур. Аднак розніца паміж імі каласальная.**





Польшча развіталася з ахвярамі катастрофы пад Смаленскам. Вяртанне ў будні падштурхнула шматлікіх польскіх журналістаў задумацца над глабальнымі наступствамі трагедыі для краіны. На думку большасці, ёсць усе падставы для аптымізму.

«Польшча здала іспыт як праравая дзяржава. Палажэнні Канстытуцыі, якія былі шмат разоў прадметам крытыкі, аказаліся непарушнымі, калі размова зайшла пра перадачу ўлады ва ўмовах крызісу. Усё, што адбылося ў Варшаве, Кракаве і Маскве, стала дэманстрацыяй добрай арганізацыі дзяржаўных структур. Дзяржава, якая не была дзяржавай партыі «Права і Справядлівасць» або партыі «Грамадзянская платформа», не будзе дзяржавай і якой-небудзь іншай партыі», — піша «Gazeta Wyborcza».

Незвычайную атмасферу нацыянальнага адзінства шмат хто называе часам нараджэння новай палітычнай культуры. Перш за ўсё красавік 2010 года надаў новы статус гістарычным міфам у грамадскай дыскусіі. Для палякаў Катынь цяпер у большай ступені шок і смутак 10 красавіка, напэўна, не менш трагічныя, чым шок і смутак 70-гадовай даўніны. Менавіта на гістарычных траўмах будавалі сваю палітыку польскія правыя партыі.

«Польшча вызвалілася ад путаў гісторыі, — адзначае французская «Liberation» і дае сваё бачанне будучага гэтай дзяржавы: — Польшча — краіна ў стане эканамічнага буму, краіна маладых, краіна з урбаністычнай культурай, краіна, упэўненая ў сабе і сваёй бяспецы настолькі, што не вагаючыся падтрымлівае ініцыятывы Барака Абамы наблізіцца да Масквы, каб супрацьстаяць Ірану. Фатальным чынам Катынь адчыніла і зачыніла 70 гадоў польскай драмы».

Адной з галоўных характэрных рысаў новай Польшчы тыя ж французы называюць новае стаўленне палякаў да Расіі. Праблем тут хапае, аднак, здаецца, сапраўды нешта зрушылася. «Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў, нягледзячы на вулканічныя хмары, якія ўтрымалі шматлікіх лідэраў іншых дзяржаў, прыляцеў у Кракаў на пахаванне Леха Качыньскага. Дыялог паміж нашымі краінамі патрэбны. Трагедыя пад Смаленскам і прыезд Мядзведзева той дыялог разблакіравалі. Трэба намагацца не марнаваць час», — каментуе «Gazeta Wyborcza».

Гэты працэс імклівага перагляду адносін з Расіяй, між тым, адбываецца і ў нас, што дазваляе параўнаць новы польскі палітычны дыскурс з беларускім варыянтам.

Для таго, каб пераканацца ў зменах рыторыкі беларускіх уладаў, дастаткова згадаць некалькі цытат з паслання А. Лукашэнкі Нацыянальнаму сходу і народу. «Сёння стаіць пытанне: мы будзем незалежнай дзяржавай з ганарлівым народам або мы і далей будзем поўзаць перад кімсьці на каленях?» — сказаў прэзідэнт. Лукашэнка таксама адзначыў, што менавіта Масква падрывае падмурак Саюзнай дзяржавы, «узяўшы курс на так званую прагматызацыю адносін і вырашыўшы перавесці іх на так званыя рынкавыя рэйкі».

Такія катэгарычныя, не падобныя на мінулыя, антымаскоўскія заявы дазваляюць казаць пра станаўленне ў краіне новай палітычнай дыскусіі, якая мусіць адпавядаць задачам палітыкі шматвектарнасці. На польскую яна абсалютна не падобная. Там у аснову палітычнай этыкі пакладзены прынцып павагі да апанента, шматкроць узмоцнены пасля авіякатастрофы пад Смаленскам разуменнем каштоўнасці кожнага індывідуума.

Характэрнымі ж рысамі палітычнай культуры, якая сфарміравалася ў Беларусі ў часы так званай «шматвектарнасці», а зараз мадыфікуецца, з'яўляецца поўная адсутнасць маральнага аўтарытэта і рэферэнта, ролю якога выконвала былая савецкая і расійская інтэлігенцыя. Новыя расійскія валадары думак нічога не значаць для нашых мандарынаў, як сівых, сфармаваных у часы СССР, так і маладых, узнесеных на верхнія прыступкі вертыкалі А. Лукашэнкі. Сваіх жа, беларускіх валадароў думак, яны і так ніколі не чыталі, не слухалі. Адсюль яшчэ больш дыктат, валюнтарызм, прыземленыя прагматызм і эмацыйнасць.

Лепшага прыкладу, чым нашумелая гісторыя з Бакіевым, цяжка ўявіць. Як сведчыць сам А. Лукашэнка, матывы запрасіць кіргізскага палітыка ў Беларусь ляжалі ў галіне чалавечай псіхікі, а само рашэнне было прынята літаральна ў ходзе невялікай размовы.

«Ён прасіў не за сябе, а за сям'ю: Аляксандр, забяры сям'ю, дзяцей шкада, яны не вінаватыя. Я кажу: па-першае, табе трэба абследавацца пасля ўсяго гэтага, рэабілітавацца. Ты нават не думай пра дзяцей і сям'ю, я і цябе забяру. Ты прэзідэнт краіны, і я прыму цябе як прэзідэнта краіны, а не як ізгоя», — распавёў Лукашэнка.

Наступствы такіх хуткіх эмацыйных рашэнняў як мінімум вельмі супярэчлівыя.

Беларусь дала прытулак чалавеку, якога на радзіме абвінавачваюць у масавых забойствах, падазраюць у выкраданні 200 мільёнаў долараў. Падзенне Бакіева вітала ўся грамадскасць Сярэдняй Азіі, якая марыць пра палітычныя змены ў сябе на радзіме. Можна ўявіць, які імідж набыла цяпер у гэтым рэгіёне Беларусь. Лукашэнка ўпарта трымае Бакіева за дзеючага прэзідэнта Кыргызстана, і тым самым апрыёры не прызнае кіргізскі Часовы ўрад, які прызналі Казахстан і Расія.

Усе згаданыя краіны — сябры структур СНД і АДКБ. Як будуць далей будавацца адносіны ўнутры гэтых арганізацый, зараз цяжка ўявіць. Для пачатку, хаця б, як праводзіць іх сустрэчы і пасяджэнні? Або ўвогуле з Кыргызстана нікога не запрашаць, або запрашаць дзве кіргізскія дэлегацыі, або падзяліцца на групы, кожная з якіх будзе працаваць з тымі кіргізамі, якіх лічыць легітымнымі?

Аднак самае непрыемнае ў іншым. Не часта пагаджаешся са скандальным крамлёўскім каментатарам Лявонцьевым, вядучым праграмы «Однако», але на гэты раз, трэба сказаць, у нечым ён мае рацыю: «Не можа ж Лукашэнка не разумець, што, адстойваючы Бакіева, ён адстойвае грамадзянскую вайну». Калі нешта падобнае, не дай Божа, адбудзецца, то адказнасць за гэта будзе часткова несці і Беларусь.

Вось такі ў нас новы шматвектарны, мала падобны на польскі, палітычны дыскурс.

СПРАВА

# ПРЫСУД — ПРАЗ ДВА ТЫДНІ

**6 мая ў Вярхоўным судзе Беларусі будзе абвешчаны прысуд па справе ваўкавыскіх прадпрымальнікаў Мікалая Аўтуховіча і Уладзіміра Асіпенкі.**



Мікалай Аўтуховіч, Уладзімір Асіпенка, а таксама Аляксандр Ларын абвінавачваюцца ў падрыхтоўцы тэрарыстычнага акта ў дачыненні да намесніка міністра па падатках і зборах Васіля Камянко і былога старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Саўчанкі. Аўтуховіча і Асіпенку да таго ж абвінавачваюць у арганізацыі падпалу дома былога начальніка Ваўкавыскага РАУС Кацубы ў 2004 годзе. Падпалкоўнік міліцыі Казлоў, былы кіраўнік упраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю па Гродзенскай вобласці, абвінавачваецца ў тым, што ведаў пра планы падрыхтоўкі тэрарыстычнага акта, але не прыняў мераў па яго прадухіленні.

Слуханні справы завяршыліся, абвінавачваемыя выступілі з апошнім словам. Уладзімір Асіпенка цалкам не прызнаў сваёй віны і назваў крымінальную справу ў дачыненні да яго сфабрыкаванай. Як перадае БелаПАН, прадпрымальнік расказаў пра ціск, які следства аказвала на яго асабіста і сям'ю. Гэта прывяло да таго, што яго старэйшая дачка пакінула Беларусь. Мікалай Аўтуховіч таксама не прызнаў сваёй віны і апошняе слова ў судзе прысвяціў агучванню фактаў карупцыі ў Гродзенскай вобласці. Судовы працэс ваўкавыскі прадпрымальнік лічыць звяном у ланцугу пераследавання, якое пачалося яшчэ ў 2003 годзе з ініцыятывы высокіх чыноўнікаў. Міхаіл Казлоў акцэнтаваў увагу на парушэннях, што мелі месца падчас расследавання справы.

Пракурор Эльдар Сафараў запатрабаваў прыгаварыць Аўтуховіча да 20 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці, Асіпенку і Ларына — да 11 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Для Міхаіла Казлова ён прасіў тры гады калоніі агульнага рэжыму без права займаць кіруючыя пасады.

Праваабаронцы лічаць гэту крымінальную справу палітычна матываванай. У час судовых слуханняў назіральнікі адзначалі разыходжанні ў папярэдне сабраных фактах датычнасці да злачынстваў абвінавачваемых і прадстаўленай доказнай базы. Многія са сведак на судзе адмовіліся ад сваіх паказанняў, а таксама прызналіся ў ціску з боку следчых.

АКЦЫЯ

# ШЛЯХ ПАДЗЯЛІЎ АПАЗІЦЫЮ

Вольга ХВОІН

**Традыцыйны арганізатар «Чарнобыльскага шляху» — партыя БНФ — сёлета адмаўляецца ад удзелу ў шэсці і плануе накіраваць сваіх актывістаў у рэгіёны, якія пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС. Эстафету вулічнай акцыі пераняў аргкамітэт па стварэнні партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя».**

Мінгарвыканкам дазволіў жалобнае шэсце ад Акадэміі навук да парка Дружбы народаў. Збор а 18.00 на пляцоўцы перад Акадэміяй навук. Заяўлены маршрут у цэнтр горада да Кастрычніцкай плошчы адхілены. Прадстаўнікі Беларускай хрысціянскай дэмакратыі зазначаюць, што асноўны сэнс правядзення «Чарнобыльскага шляху–2010» — пачатак кампаніі па стварэнні грамадскага камітэта па абароне беларусаў ад наступстваў чарнобыльскай катастрофы «У абарону жыцця». Вулічную акцыю падтрымаюць прадпрымальнікі, аргкамітэт па стварэнні руху салідарнасці «Разам», «Малады Фронт», чарнобыльскія ініцыятывы.

Кіраўніцтва партыі БНФ сёлета вырашыла ўстрымацца ад удзелу ў «Чарнобыльскім шляху». Як заявіў лідэр партыі Аляксей Янукевіч, прычыны гэтага — жаданне «сапраўды прыцягнуць увагу грамадства», а таксама «не ствараць пляцоўку для піяру розным арганізацыям». Маюцца на ўвазе прадстаўнікі ЛГТБ-супольнасці, анархістаў і ультраправых, якія апошнія гады актыўна ўдзельнічаюць у «Чарнобыльскім шляху». Дарэчы, лідэр «Маладога Фронту» Зміцер Дашкевіч паабяцаў радыкальна абыходзіцца з няпрошанымі гасцямі шэсця. «Мы збіраемся вярнуць акцыі жалобны характар, — зазначыў малады палітык. — Прысутнасць на шэсці анархістаў ды прадстаўнікоў сексуальных меншасцяў будзем расцэньваць як правакацыю. Правакатараў будзем звязваць і здаваць міліцыі».

Актывісты партыі БНФ плануюць наведаць раёны, якія найбольш пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС, а таксама пералічыць грошы, зробленыя на рэспубліканскім суботніку, у медустановы. «24 красавіка, калі адбудзецца ўсебеларускі суботнік, нашы структуры, якія будуць працаваць у гэты дзень, пералічаць зароблены сродкі на рахунак гомельскага і магілёўскага анкалагічных дыспансераў. Мы звяртаемся сёння да ўсіх беларусаў, якія працуюць на прадпрыемствах, каб яны пераконвалі кіраўніцтва грошы з суботніку пералічыць на рахункі названых дыспансераў, а не ў абстрактныя фонды. Таксама мы плануем выезд у зону, што пацярпела ад Чарнобыльскай катастрофы, там будзем упарадкоўваць помнікі выселеным вёскам, сустракацца з людзьмі, перадаваць сродкі, сабраныя структурамі партыі БНФ», — патлумачыў палітык.

СМІ

# У АБАРОНУ СВАБОДЫ

**Тэрміновую рэзалюцыю па свабодзе СМІ ў Беларусі прынялі 18 красавіка на Агульным сходзе Еўрапейскай федэрацыі журналістаў у Стамбуле.**

Журналісцкая супольнасць выказала салідарнасць са сваімі беларускімі калегамі, а таксама заклікала ўлады Беларусі спыніць дыскрымінацыю незалежных СМІ, забяспечыць поўны доступ да інфармацыі і прывесці нацыянальнае заканадаўства ў галіне СМІ ў адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі.

Дэлегаты форуму заклікалі інстытуцыі Еўрасаюза, Раду Еўропы і АБСЕ адсочваць парушэнні свабоды СМІ ў Беларусі і абараняць свабоду медыяў і правы журналістаў у Беларусі.

**Прэс-служба БАЖ**

КАМПАНІЯ

# БУДЗЬМА МІЛАСЭРНЫМІ

Аляксандр ТАМКОВІЧ

**Не трэба быць філолагам, каб зразумець, што па этымалогіі словы «міласэрнасць» і «дабрачыннасць» паходзяць са спалучэнняў «мілае сэрца» і «добры чын». Відавочна і тое, што другое з'яўляецца следствам першага, бо без жадання «матораў» не будзе і прыгожых дзеянняў.**

І тут я цалкам згодны з лідэрам гурта «Neuro Dubel» Аляксандрам Кулінковічам — адкрыць свой кашалёк вельмі цяжка. Сапраўды, беларускія музыкі — не алігархі, якія могуць пабудаваць свае катэджы на паверх меншымі і за кошт гэтага некаму дапамагчы. Аднак менавіта яны і сталі ініцыятарамі правядзення «Добрага фэсту». Дакладней, лідэр гурта «IQ48» Яўген Бузоўскі. Адпаведная акцыя адбылася 22 красавіка ў знакамітым клубе «Рэактар», а да ўжо названых музыкаў можна дадаць гурты «:B:N:», «ZM99», «Палац», дабрачынны фонд «Добра тут» і Грамадскую культурніцкую кампанію «Будзьма беларусамі!».

На апошніх, на мой погляд, ёсць сэнс спыніцца больш падрабязна. Літаральна тыдзень таму яны абвясцілі пра сваю новую стратэгію — і вось «першая ластаўка». Яна «яшчэ не робіць вясну», але тое, як хутка за словамі прыйшлі справы, даволі красамоўна сведчыць пра тое, што яна не за гарамі.

«Узровень дабрачыннасці — паказальнік развіцця грамадства. Не столькі матэрыяльнага, колькі духоўнага і маральнага. На жаль, такія традыцыі ў Беларусі не настолькі глыбокія, як і ў іншых краінах». Словы гэтыя належаць адной з каардынатараў Грамадскай культурніцкай кампаніі «Будзьма беларусамі!» Ніне Шыдлоўскай, і з ёй цяжка не пагадзіцца. Думаю, кожны пацвердзіць, што ў такіх выпадках у нас абавязкова шукаюць нейкае «двайное дно». За гады савецкай улады ўсе мы прызвычаіліся да таго, што ў жыцці немагчыма нешта «проста так».

Абвергнуць гэты «прынцып» і належыць «Добраму фэсту». А дапамогуць ім хворыя дзеці з Чэрвеньскага і Гродзенскага дамоў-інтэрнатаў, бо атрыманыя сродкі пойдуць менавіта ім. І не як запісы ў фінансавых дакументах, а як канкрэтныя матэрыяльныя рэчы.

ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ

# БАКІЕЎ ЛІЧЫЦЬ СЯБЕ ПРЭЗІДЭНТАМ

Генадзь КЕСНЕР

**Скінуты ў выніку вядомых падзеяў у Кыргызстане прэзідэнт гэтай краіны Курманбек Бакіеў не збіраецца складаць з сябе паўнамоцтвы кіраўніка дзяржавы. Пра гэта ён заявіў журналістам падчас брыфінгу, што адбыўся 21 красавіка ў мінскай штаб-кватэры СНД.**



«Мой народ перажывае страшную трагедыю: банда самазванцаў абвясціла сябе ўладай і чыніць гвалт, забівае мірных людзей, разбурае жытло. Рабаўніцтва і гвалт робіцца нормай жыцця. Краіна адкінута на дзесяткі год назад, — заявіў Бакіеў. — Я як прэзідэнт Кыргызстана, як гарант Канстытуцыі не здымаю з сябе адказнасць за катастрофу, якую перажывае мой народ, і гатовы адказаць за гэта па закону. Але гэта не азначае, што я магу падпарадкавацца бандытам і пакінуць мой народ у бядзе».

З гэтай нагоды Курманбек Бакіеў зрабіў шэраг заяў. Па-першае, ён выказаў спачуванне ўсім сваякам і блізкім загінулых. «Па-другое, я не прызнаю сваю адстаўку. Дзевяць месяцаў таму народ Кыргызстана абраў мяне прэзідэнтам, і я прысягнуў служыць яму. Няма сілы, якая прымусіла б мяне адмовіцца ад маёй клятвы. Толькі смерць спыніць мяне. Я, Курманбек Бакіеў, — законна абраны прэзідэнт Кыргызстану, прызнаны міжнароднай супольнасцю. Па-трэцяе, усе мусяць ведаць, што бандыты, якія спрабуюць захапіць уладу, ёсць выканаўцамі чужой волі і не маюць ніякай легітымнасці. Кыргызстан не будзе нічыёй калоніяй, мой народ хоча быць свабодным і будзе свабодным, працягне будаўніцтва сучаснай незалежнай дэмакратычнай дзяржавы».

Бакіеў нагадаў, што 7 красавіка прэзідэнцкім указам увёў у шэрагу раёнаў краіны надзвычайнае становішча згодна з дзейнай Канстытуцыяй Кыргызстана. «Я хачу, каб кожны грамадзянін разумеў, што, выконваючы загады банды, ён ставіць сябе па-за законам і робіцца саўдзельнікам злачынстваў з усімі наступствамі. Пакаранне за злачынствы непазбежна», — прыгразіў скінуты галава Кыргызстана.

Курманбек Бакіеў заклікаў лідэраў сусветнай супольнасці «не ствараць прэцэдэнт, не прызнаваць банду легітымнай уладай». «Я настойваю на правядзенні незалежнага міжнароднага расследавання і пакарання вінаватых у гібелі людзей, марадзёрстве і распальванні міжнацыянальнай варожасці», — заявіў аратар. Ён звярнуўся да палітычных лідэраў СНД: «Нашай свабодзе і незалежнасці менш за два дзесяткі год. Не адступайце перад грубай сілаю, вы ў адказнасці за свой народ».

Бакіеў заклікаў грамадзян Кыргызстана не верыць, што яны адзінокія, і запэўніў, што ў Кіргізаў ёсць надзейныя сябры, якіх нямала і на якіх можна «абаперціся ў цяжкую хвіліну і выратаваць краіну ад вялікай бяды».

«Я зраблю ўсё, каб вярнуць жыццё ў Кыргызстане ў канстытуцыйнае поле, і ні пры якіх абставінах не дазволю бандытам вызначаць лёс нашага народа. Я ўпэўнены: воля майго народа — пераадолець смуту», — заявіў Курманбек Бакіеў пры канцы свайго выступу.

Варта адзначыць, што Курманбека Бакіева прымаюць у Мінску як дзейнага кіраўніка дзяржавы — з перакрыццём грамадскага руху на галоўных вуліцах беларускай сталіцы па шляху яго следавання (калі ён ехаў на брыфінг і вяртаўся з яго), а парадак у будынку штаб-кватэры СНД, дзе адбываўся выступ Бакіева, забяспечвалі кіраўнікі Службы бяспекі беларускага прэзідэнта.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# А Я АДЗІН У БЕЛЫМ ФРАКУ!

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Шчыра кажучы, чакалася ад штогадовага паслання прэзідэнта большага. Усё ж, як-ніяк, 2010 — год выбараў. Здавалася б, прэзідэнт павінен быў бы выказаць нейкія новыя ідэі і думкі, як ён рабіў гэта заўжды. Гэтага не адбылося.**



Што мы пачулі з прэс-канферэнцыі новага? Новае было толькі тады, калі Аляксандр Рыгоравіч пачаў адказваць на пытанні дэпутатаў. Па-першае, мы даведаліся пра тое, што Курманбек Бакіеў з сям'ёй знаходзіцца ў Мінску. Лукашэнка прыняў яго з гуманітарных меркаванняў.

«Ноччу ў панядзелак я даручыў адпаведным службам, каб арганізавалі перапраўку Бакіева ў Мінск. Ён пра гэта прасіў, і не аднойчы. Ноччу ў панядзелак ён быў у Мінску», — сказаў прэзідэнт. Паводле слоў Лукашэнкі, «прызначана медыцынская камісія, праведзена першаснае абследаванне сям'і» Бакіева.

На думку прэзідэнта, рашэнне адносна Бакіева магла б прыняць АДКБ, сябрам якой з'яўляецца Кыргызстан. «Што гэта за АДКБ? Расія там старшынствуе? Ёй Бог загадаў: давайце збяромся, абмяркуем, запросім яго туды. І скажам тым, хто ўладу там захапіў: пачакайце, давайце разбяромся, пагутарым. Можа, Курманбек не мае рацыі — мы яму пра гэта скажам. Тады мы вас падтрымаем, і не трэба будзе вам, гэтак званаму часоваму ўраду, шукаць недзе нейкую падтрымку. Але мы гэтага не зрабілі», — заўважыў Лукашэнка.

На месцы Лукашэнкі трэба было б задумацца, хто такі Бакіеў і чаму Расія праігнаравала загад Бога. Бакіеў, як вядома, прыйшоў да ўлады таксама ў выпадку «рэвалюцыі цюльпанаў». Ці не ёсць Бакіеў тым самым «дыверсантам», які па загаду Масквы і Вашынгтона навучыць талерантных беларусаў, як дзейнічаць падчас «каляровых рэвалюцыяў»? Тым больш, што, па словах Лукашэнкі, ніякай агароджы (і гэта сапраўды так) вакол Адміністрацыі прэзідэнта няма, як няма іх і вакол іншых уладных аб'ектаў.

Яшчэ адна заява прагучала наконт рашэння аб павышэнні пошлін на ўвоз аўтамабіляў для фізічных асоб у сувязі з уваходжаннем у сілу дагавора аб Мытным саюзе. «Не прынята», — адрэзаў прэзідэнт. «І больш за тое, сустракаючыся з прэм'ерам некалькі дзён таму, я паппрасіў яго: дайце мне альтэрнатыву ў сувязі з тым, што яны выключаюць некаторыя тавары і гавораць, што яны не адносяцца да Мытнага саюза, можа, і нам трэба паглядзець на штосьці», — сказаў Лукашэнка.

Нагадаем, Беларусь, Расія і Казахстан вядуць перамовы наконт адзінага ўзроўню пошлін на іншамаркі для фізічных асоб. Змены павінны адбыцца з другога паўгоддзя 2010 года, калі набудзе моц адзіны Мытны кодэкс трох краін. Мяркуецца, што пошліны могуць быць павышаны да ўзроўню дзейных у Расіі, якая зацікаўлена ў абароне свайго аўтапрама. На імпартныя аўтамабілі для юрыдычных асоб пошліны былі павышаны да расійскага ўзроўню 1 студзеня.

Такім чынам, усе ініцыятывы апазіцыі па рэферэндуме наконт пошлін на аўто пакуль не тое што заўчасныя, а гуляюць на карысць прэзідэнта. Ёсць, ёсць за што ў нас пагандляваць з Масквой! Калі не здымуць пошліны на нафту — мы не ўвядзем пошліны на машынкі. Нягледзячы на тое, што, паводле прэзідэнта, у той жа Расіі збіраюцца «Мерседэсы».

У астатнім пасланне прэзідэнта было сумным і падобным на чарговы з'езд КПСС. Беларуская эканоміка па-ранейшаму самая эканомная. Наш парк высокіх тэхналогій самы высокі парк у свеце. Шкада толькі, што яго не можна памацаць сваімі рукамі — не дабудавалі яшчэ. Наша жыллё будуецца самымі высокімі тэмпамі ў СНД, сёлета здадуць аж 7 мільёнаў квадратных метраў. Толькі чэргі на паляпшэнне жыллёвых умоваў (вось паскуды!) ніяк не жадаюць скарачацца. Мы завалім увесь свет сваёй сельскагаспадарчай прадукцыяй, — і пра гэта мы кажам з тых часоў, калі быў прыняты загад па цыбуляводству.

Можна яшчэ адзначыць, што «вашывыя блохі», як ён неаднаразова называў прадпрымальнікаў, раптам апынуліся і не блохамі, і не вашывымі. «Думаю, наспела неабходнасць прыняцця дырэктывы № 4 аб далейшай лібералізацыі эканомікі, скіраванай на разняволенне прадпрымальніцкай ініцыятывы», — заявіў прэзідэнт.

Але шлях да разняволення прадпрымальніцкай ініцыятывы вельмі просты, і на яго неаднойчы ўказвалі беларускія прадпрымальнікі. Гэта — скасаваць указы прэзідэнта (sic!), якія абмяжоўваюць права прадпрымальнікаў на найм працаўнікоў, спрасціць ліцэнзаванне, падатковую сістэму, абмежаваць кантралюючыя органы ў праверках прадпрымальнікаў і прыняць нарэшце празрысты закон аб малым бізнесе. Гэтага прадпрымальнікі патрабуюць ужо тры гады, і іхнія прапановы не раз і не два траплялі ў Адміністрацыю прэзідэнта, а потым недзе «губляліся».

Дарэчы, кіраўнік Асацыяцыі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва Сяргей Балыкін не чакае, што будзе нейкая карысць ад дырэктывы. «Як прызнаў сам кіраўнік дзяржавы, папярэднія дырэктывы фактычна не працуюць. Відавочна, што такі ж лёс напаткае і дырэктыву № 4. Рэальную лібералізацыю эканомікі немагчыма правесці пры дапамозе дырэктыў. Для гэтага патрэбна карпатлівая праца па змене заканадаўства, якая ў нашай краіне праводзіцца ў вельмі недастатковай ступені», — сказаў эксперт.

А ў астатнім — усё па-ранейшаму. ЗША на нас ціснe, Еўропа, дрэнная такая, не прымае нашых дэпутатаў у Еўранэст, Расія не дае бяспошлінай нафты, і толькі верны сябра Уга Чавес грузіць апельсіны бочкамі і дасылае нам нафту танкерамі праз паўсвету. Таму маленькі, але горды беларускі народ не скараецца, і нікога яму не нагнуць і не паставіць на калені. Карацей, як у Макарэвіча: «Мы б усіх перамаглі, толькі нас не заўважаюць».

Тым часам, Мінгарвыканкам дазволіў правядзенне 26 красавіка ў сталіцы шэсця «Чарнобыльскі шлях» па маршруце Акадэмія навук — парк Дружбы народаў. Адпаведны дазвол атрыманы арганізатарам 20 красавіка.

Між тым, 19 красавіка арганізатары «Чарнобыльскага шляху–2010» на прэс-канферэнцыі заявілі, што згодныя на кампрамісны варыянт яго правядзення.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### ІВОНКА СУРВІЛА



Старшынёй Рады Беларускай Народнай Рэспублікі падчас 27-й сесіі Рады БНР пераабраная Івонка Сурвіла. Спадарыня Сурвіла ўзначальвае «Раду БНР у выгнанні» ад 1997 года (яе папярэднікам быў Язэп Сажыч), з'яўляецца вядомай персонай беларускай эміграцыі, жыве ў Канадзе. У 1989 годзе заснавала фонд дапамогі ахвярам Чарнобылю ў Беларусі, узначаліла яго ў 1997-м. Фонд аказвае гуманітарную дапамогу пацярпелым ад аварыі на ЧАЭС, арганізоўвае лячэнне і аздараўленне дзяцей з Беларусі ў Канадзе. Аўтарка кнігі ўспамінаў «Дарога. Стоўпцы. Капэнгагэн. Парыж. Мадрыд. Атава. Менск». Прафесар, гісторык Захар Шыбека ў адным са сваіх выступаў сказаў, што «калі б у нас было многа такіх жанчын, як Сурвіла, мы б не мелі праблем з самасцвярджэннем»: «Яна дэманструе эталон беларускай ментальнасці. Яна дэманструе, якім трэба быць беларусам, у якім кірунку думаць. Як марыць, як балець за нашу Беларусь».

### АЛЯКСАНДР КІКІНЕЎ



У Баку на Чэмпіянаце Еўропы па грэка-рымскай барацьбе прадстаўнік дынамаўскай школы беларус Аляксандр Кікенеў упершыню ў сваёй спартыўнай біяграфіі стаў чэмпіёнам Еўропы ў вагавай катэгорыі да 74 кілаграмаў. У фінальным паядынку ён у драматычнай барацьбе адолеў гаспадара дывана Элвіна Мурсалеева. Мінулай восенню Аляксандр у сваю капілку ўзнагарод дадаў бронзу Чэмпіянату свету па грэка-рымскай барацьбе, а да гэтага — срэбра чэмпіянату Еўропы па грэка-рымскай барацьбе.

Атлет нарадзіўся на Гомельшчыне, навучаецца на юрыдычным факультэце Белдзяржуніверсітэта, і за свае поспехі ў спартовай кар'еры летась быў названы Лепшым спартсменам БДУ.

### СЯРГЕЙ ЛАЗНІЦА



Ураджэнец Баранавічаў Сяргей Лазніца ўдзельнічае ў 63-м Канскім кінафестывалі. З ігравой стужкаю «Шчасце маё» ён уключаны ў конкурсную праграму. Прэстыжны фэст пройдзе з 12 па 23 мая.

Як піша кінакрытык Андрэй Расінскі, «Лазніца добра вядомы ў дакументальным кіно і мае статус прыжыццёвага класіка і рэфарматара кінамовы. Ягоная стужка «Паўстанак» знятая як метафізічнае насланнё. У фільме «Пасяленне» праз твары хворых праступае вобраз і падабенства Божае». Летась Лазніца ўдзельнічаў у расійскім фестывалі дакументальнага кіно са стужкай «Паўночнае святло». За права лічыць Сяргея Лазніцу сваім творцам спрачаюцца Расія і Украіна. У Беларусі ёсць усе шанцы далучыцца да гэтай спрэчкі. Наступная ігравая стужка, якую плануе зняць Сяргей Лазніца, — экранізацыя аповесці Быкава «У тумане».

Дэбютная ігравая стужка рэжысёра «Шчасце маё» знятая пры падтрымцы Германіі, Галандыі і Украіны. Аператарам фільма з'яўляецца Алег Муту, які стварыў вядомы фільм «4 месяцы, 3 тыдні, 2 дні». Гукарэжысёр — беларус Уладзімір Галаўніцкі, а галоўную ролю вадзіцеля-дальнабойцы сыграў актор беларускага Тэатра юнага гледача Віктар Немец. Дзеянне фільма адбываецца ў постсавецкай глыбінцы. «Кіроўца-дальнабойнік Георгій пакідае дома няверную жонку і адпраўляецца ў чарговы рэйс. Яго грузавік павольна рухаецца да мэты, а сам ён здзяйсняе пагружэнне ў свет страху, жорсткасці і здрады», — гаворыцца ў рэлізе фільма.

Сяргей Лазніца нарадзіўся ў Баранавічах у 1964 годзе, затым пераехаў з бацькамі ў Кіеў. У 1981 годзе будучы рэжысёр паступіў у Кіеўскі політэхнічны інстытут на кафедру прыкладной матэматыкі факультэта сістэм кіравання і абараніў дыплом па спецыяльнасці інжынер-матэматык. Працаваў навуковым супрацоўнікам у Інстытуце кібернетыкі. Паралельна працаваў перакладчыкам з японскай мовы. У 1991 годзе Сяргей паступіў ва Усерасійскі дзяржаўны інстытут кінематаграфіі на аддзяленне рэжысуры ігравога кіно ў майстэрню Наны Джорджадзе і скончыў яго з адзнакай. З 2000 года працуе рэжысёрам на студыі дакументальных фільмаў у Санкт-Пецярбурзе. Зняў шэраг поўнаметражных і кароткаметражных дакументальных фільмаў.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ХТО АСУШЫЎ ЭЛЕКТАРАЛЬНАЕ «БАЛОТА»?

Сяргей НІКАЛЮК

**Структура беларускага грамадства з'яўляецца рамкай, якая абмяжоўвае электаральныя фантазіі прэтэндэнтаў на прэзідэнцкую пасаду.**



Аднойчы мне давялося патрапіць на «круглы стол», дзе абмяркоўвалася праблема праймерыз. Аўтары ідэі пераконвалі прысутных, што пераможца праймерыз «будзе мець зусім іншую легітымнасць, і ў яго будзе прынцыпова іншая палітычная вага». Я меў смеласць выказаць на гэты конт шэраг крытычных заўваг, за што і атрымаў ад калегаў па цэху па поўнай праграме.

Працытую: «Супраць ідэі праймерыз жорстка выступіў толькі Сяргей Нікалюк, — ён матываваў свой пункт гледжання вельмі арыгінальнымі пасыламі: «Адважуся сцвярджаць, што персаналія кандыдата не мае ніякага ўплыву на вынікі выбараў. І ніяк не залежыць ад кампаніі, якую праводзіць кандыдат». А залежыць ад таго, што, як Нікалюк сцвярджае (і лічыць, што грунтуецца ён у гэтым на сацыялогіі), «у нас працэнтаў 60 грамадзян, якія падтрымліваюць аўтарытарны лад».

Сапраўды, усё так. Ад арыгінальнага пасылу не адмаўляюся і лічу, што мае высновы грунтуюцца на сацыялогіі. Звернемся да Табліцы 1, запазычанай на сайце НІСЭПД. У 2006 годзе ад колькасці апытаных Лукашэнка атрымаў 58,2% галасоў. На самай справе, прыкладна на 2,6% больш. Звярніце ўвагу на радок: «Няма адказу/ Не хачу адказваць». Аналіз паказвае, што рэспандэнты, якія адмовіліся адказваць, дзеляцца прыкладна пароўну паміж Лукашэнкам і дэмакратычнымі кандыдатамі. А зараз прапаную скарыстацца правілам складання. Колькі атрымалася ў выніку? У мяне — 60,8%.

Тады ў чым пытанне? Можна, пры жаданні, зладзіць дыскусію: маўляў, падтрымка аўтарытарнага лідэра на выбарах яшчэ не азначае падтрымкі аўтарытарнага ладу. Пры жаданні — можна. Аднак у мяне такога жадання няма. Таму я прапаноўваю выказацца больш прасунутым аналітыкам па пытанні, якім жа чынам беларусы, што ўспрымаюць «каштоўнасці дэмакратыі, свабоды, права і рынкавай эканомікі ў значна большай ступені, чым дзейсная ўлада і асабіста Лукашэнка», галасуюць пры гэтым за Лукашэнку?

## Трасянка як фактар дэмабілізацыі

Пяройдзем да дэмакратычных кандыдатаў. У 1994 годзе гэта былі Пазняк і Шушкевіч, у 2001-м — Ганчарык, а ў 2006-м — Мілінкевіч і Казулін. Паўторым апісаную вышэй аперацыю складання і атрымаем наступны шэраг: 27,1%, 25,3% і 26,1%. Нагадаю, памылка выбаркі складае 3%. А зараз хай кіне ў мяне камень той, хто здольны растлумачыць, чым прыведзеныя вынікі адрозніваюцца адзін ад аднаго.

Можна доўга разважаць, напрыклад, чым Ганчарык не падобны да ўдзельнікаў дэмакратычных тандэмаў, але з пункта гледжання здольнасці кансалідаваць галасы апанентаў Лукашэнкі — не адрозніваецца нічым.

Аднак гэтага мала: такая электаральная стабільнасць фіксавалася ў розных палітыка-эканамічных умовах. Адзін прыклад. У 1994 годзе 17,3% рэспандэнтаў заяўлялі, што мовай паўсядзённых зносін для іх з'яўляецца беларуская. У 2001 годзе такіх было ў 10 разоў менш. Той, хто думае, што гэта адбылося за кошт русіфікацыі, — памыляецца. За гэты перыяд колькасць тых, хто размаўляе на рускай мове, знізілася з 66,6% да 46,4%. «Выбылыя» перайшлі на трасянку: у 1994 годзе — 6,4%, у 2001-м — 30,0%!

Цяжка знайсці больш пераканаўчую ілюстрацыю нацыянальнай мабілізацыі ў 1994 годзе. Беларусь у гэтым сэнсе не была выключэннем. Крах СССР стымуляваў пошук нацыянальных каранёў. У той час прызнацца нават самому сабе ў тым, што размаўляеш на трасянцы, было вельмі не проста. Але як гэта адбілася на падтрымцы кандыдатаў, што выступалі пад сцягам нацыянальнага адраджэння? На жаль, ніяк.

Структура электаральных прыхільнасцяў беларусаў дэманструе зайздросную стабільнасць. Калі скласці ў першай калонцы галасы, пададзеныя за Лукашэнку, з галасамі «за іншых кандыдатаў» (Кебіч, Дубко, Новікаў), то ў выніку атрымаецца 53,6%. Гэта менш 60%, але выключна за кошт нізкай яўкі і галасавання супраць усіх. Гэта ж сітуацыя паўтарылася ў 2001 годзе. А вось на апошніх прэзідэнцкіх выбарах у год максімальнага рэсурсавага багацця яўка аказалася рэкорднай, але ўсе дадатковыя галасы атрымаў Лукашэнка.

## На каго абапіраецца ўлада?

Хто ў Беларусі галасуе за Лукашэнку? У першую чаргу, людзі немаладыя, з нізкім узроўнем адукацыі, якія жывуць у сельскай мясцовасці, — тыя, хто без падтрымкі дзяржавы ў сучасных умовах не здольны выжыць. У апанентаў аўтарытарнага лідэра процілеглыя характарыстыкі. Яны маладыя, адукаваныя і жывуць у вялікіх гарадах. Як бачыце, ніякай ідэалагічнай падаплёкі ў гэтым няма.

Маладым і адукаваным такая ўлада замінае. Яна не дазваляе ім самарэалізавацца. З гэтай схемы вынікаюць дзве практычныя высновы. Па-першае, падзенне рэйтынгу Лукашэнкі, што назіралася на мяжы 2002–2003 гадоў, не прыводзіць да росту рэйтынгу апазіцыі. Зразумець гэта нескладана. Прадстаўнікі перыферыйных сацыяльных груп, што расчараваліся ў сваім куміры, уласных рэсурсаў ад гэтага не набываюць, а таму попыту на дэмакратыю і свабоду ў іх не ўзнікае. Па-другое, з гадамі колькасць прыхільнікаў Лукашэнкі не памяншаецца, таму што на месца адных пенсіянераў прыходзяць іншыя.

На каго ж абапіраецца Лукашэнка? На думку беларусаў, на чыноўнікаў, сілавікоў і пенсіянераў (Табліца 2). А хто ў канцы спісу? Бізнесмены, навуковая і культурная эліта і спецыялісты. Вось з такой расстаноўкай прыярытэтаў Беларусь увайшла ў XXI стагоддзе. Якія пры такім раскладзе яе перспектывы на міжнародных рынках — тэма асобнай размовы. У гэтым артыкуле гаворка ідзе пра структуру электарату. Зразумела, што сацыяльна арыентаваная паліцэйская дзяржава эканамічна актыўных беларусаў не цікавіць, таму за яе заснавальніка яны не галасуюць.

Ці азначае гэта, што яны з'яўляюцца прыхільнікамі апазіцыі? Здавалася б, Табліца 1 пра гэта сведчыць. Аднак не ўсё так проста. Электаральныя рэйтынгі палітыкаў вызначаюцца пры адказе на пытанне: «Калі б прэзідэнцкія выбары адбыліся заўтра, за каго б Вы прагаласавалі?». У Лукашэнкі апошнія паўтара гады электаральны рэйтынг стабільны (каля 40%). Сярод апазіцыйных палітыкаў толькі Мілінкевіч можа пахваліцца рэйтынгам, які перавышае статыстычную памылку, што ніяк не стасуецца з вынікамі прэзідэнцкіх выбараў.

Выкажу сваё тлумачэнне дадзенага парадоксу. Большасць апанентаў аўтарытарнага рэжыму галасуюць не за дэмакратычных кандыдатаў, а супраць Лукашэнкі. Арганізуючы кампанію ў сваю падтрымку, Лукашэнка насуперак уласнаму жаданню мабілізуе не толькі сваіх прыхільнікаў, але і апанентаў. І чым магутней мабілізацыйная кампанія, тым мацней палярызацыя грамадства. Таму я і сцвярджаю, што «персаналія кандыдата не мае ўплыву на вынікі выбараў. І ніяк не залежыць ад кампаніі, якую праводзіць кандыдат».

## Трэцяга не дадзена

Звернемся да заходняга досведу. Там на палітычным «пятачку» ўтварацца таўкатня партый, якія выбарцамі практычна не адрозніваюцца адна ад адной. Бо самыя папулярныя партыі — цэнтрысцкія, а асноўная маса насельніцтва з пункту гледжання палітычных прыхільнасцяў групуецца ў цэнтры.

Так узнікае «балота». За яго падтрымку і разгортваецца асноўнае змаганне падчас выбарчых кампаній. Ідэалогіі пры гэтым адыходзяць на другі план, а поспех дасягаецца за кошт тэхналогій. Дробязяў тут не бывае. Да гэтага часу я не магу забыць, як пасля адстаўкі Шушкевіча адзін беларускі паліттэхнолаг на поўным сур'ёзе тлумачыў, што адной з прычын вызвалення спікера ад пасады была адсутнасць у прэсе яго фатаграфій з хатнімі жывёламі!

Працытую сусветнага гуру выбарчых тэхналогій француза Жака Сегелу: «Выбары выйграюцца на нейтральнай паласе, шляхам пераканання большай колькасці тых, хто вагаецца, чым тое здолеў зрабіць супернік». Выдатныя словы, але да нас яны ніякага дачынення не маюць. У нас няма палітычнага цэнтра — такім чынам, няма і «балота». Ёсць толькі прыхільнікі і апаненты ўлады.

У перапынках паміж выбарчымі кампаніямі значная частка прыхільнікаў і апанентаў улады «спіць». Падчас сацыялагічных апытанняў «сон» патэнцыйных выбарцаў фіксуецца ў падвышанай колькасці тых, хто не вызначыўся з адказамі. Набатны звон мабілізацыйнай кампаніі можа іх абудзіць, але не здольны памяняць палітычныя прыхільнасці. Ні ўлада з яе практычна не абмежаванымі медыйнымі рэсурсамі, ні тым больш апазіцыя змяніць палітычныя густы тых, хто «прачнуўся», не ў стане.

Калі я сцвярджаю, што «персаналія кандыдата не мае ніякага ўплыву на вынікі выбараў», то маю на ўвазе агульную колькасць галасоў, якія на прэзідэнцкіх выбарах здольны сабраць апазіцыйны кандыдат. Калі ж кандыдатаў некалькі, то размеркаванне галасоў усярэдзіне апазіцыйнага сегмента вызначаюцца ступенню іх апазіцыйнасці з пункту погляду электарату. Прыгадаем выбары 2006 года. Казулін, на мой погляд, будаваў сваю выбарчую кампанію больш ярка. Фраза: «Саша, дзе грошы?» і сёння не забытая. Аднак ён атрымаў галасоў у 4 разы менш за Мілінкевіча (па дадзеных НІСЭПД). Уся справа ў тым, што Казулін пазіцыянаваў сябе ў якасці незалежнага кандыдата, а Мілінкевіч сваё права прадстаўляць апазіцыю атрымаў на Кангрэсе дэмакратычных сіл.

З дадзенага факту належных высноў не зроблена і на гэты дзень. Працытую Міхалевіча: «Я не хачу, каб мяне характарызавалі як чалавека, блізкага да ўлады, і чалавека, блізкага да апазіцыі. Я хачу стварыць свой імідж як імідж незалежнага кандыдата, які не звязаны ні з сістэмнай апазіцыяй, ні з цяперашняй уладай». Стварыць такі імідж у Беларусі не так проста, але калі спроба Міхалевіча будзе паспяховай, то ён апынецца ў той частцы электаральнага поля, на якой адсутнічаюць выбарцы.

Улада любіць разважаць пра адзінае беларускае грамадства, якое яднаецца «вакол свайго лідэра», што не перашкаджае ёй адначасова грамадства расколваць. Звернемся да Табліцы 2, якая дэманструе сутнасць беларускай палітыка-эканамічнай мадэлі. У чым яна? У пераразмеркаванні рэсурсаў ад эканамічна актыўных грамадзян да чыноўнікаў, сілавікоў і пенсіянераў. Здавалася б, так жыве ўвесь цывілізаваны свет. Так, ды не так. У цывілізаваным свеце эканамічна актыўныя грамадзяне (карміцелі) не заганяюцца ў рэзервацыі. Яны ўдзельнічаюць у палітычным жыцці і, адпаведна, у пераразмеркаванні рэсурсаў. У Беларусі права пераразмяркоўваць рэсурсы манапалізавана ўладай, і для захавання гэтай манаполіі ёй патрэбна было расколваць грамадства.

**ТАБЛІЦА 1. ЗА КАГО ВЫ ГАЛАСАВАЛІ НА МІНУЛЫХ ПРЭЗІДЭНЦКІХ ВЫБАРАХ? (%)**

| Варыянт адказу | 1994 | 2001 | 2006 |
|---|---|---|---|
| А. Лукашэнка | 34,7* | 48,2 | 58,2 |
| Дэмакраты | 26,4 | 21,0 | 23,5 |
| Іншыя кандыдаты | 18,9 | 2,9 | 2,0 |
| Няма адказу / Не хачу адказваць | 1,6 | 8,6 | 5,2 |
| Супраць усіх | 4,4 | 7,1 | 3,2 |
| Не галасаваў | 14,0 | 12,1 | 8,0 |

*Дадзеныя першага тура

**ТАБЛІЦА 2. НА ВАШ ПОГЛЯД, НА КАГО ПЕРШ ЗА ЎСЁ АБАПІРАЕЦЦА А. ЛУКАШЭНКА? (МАГЧЫМЫ БОЛЬШ ЗА АДЗІН АДКАЗ)**

| Варыянт адказу | 08'06 | 09'09 |
|---|---|---|
| На прэзідэнцкую «вертыкаль» | 37,0 | 39,7 |
| На вайскоўцаў, МУС, КДБ | 48,6 | 37,8 |
| На пенсіянераў | 41,4 | 37,7 |
| На дзяржаўных чыноўнікаў | 20,5 | 27,2 |
| На простых людзей | 34,2 | 24,1 |
| На вяскоўцаў | 30,2 | 23,8 |
| На дырэктараў буйных прадпрыемстваў | 13,5 | 12,8 |
| На спецыялістаў | 9,9 | 8,4 |
| На культурную і навуковую эліту | 8,3 | 4,0 |
| На бізнесменаў | 4,5 | 2,2 |

ПРАГНОЗЫ

# НЕ Ў РЭЙТЫНГУ СПРАВА

Вольга ХВОІН

**У Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Аляксандр Лукашэнка заявіў, што Беларусь павінна ўвайсці ў першую трыццатку краін з найбольш спрыяльнымі ўмовамі для прадпрымальніцкай дзейнасці. Аналітыкі Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў (BISS) лічаць, што Беларусь ужо да 2012 года мае шанцы патрапіць у другі дзесятак краін рэйтынгу, і нават не змяняючы асноў эканамічнай палітыкі.**

«Гэту задачу перад урадам я ўжо стаўлю не першы год. Трэба прызнаць, што на шляху лібералізацыі ўмоў гаспадарчай дзейнасці мы дамагліся пэўных поспехаў. Большасць рашэнняў у гэтай сферы прымаецца пасля адпаведных кансультацый з прадпрымальніцкай супольнасцю. У выніку Беларусь уключаная ў дзесятку краін, якія найбольш актыўна праводзяць рэформы», — з задавальненнем канстатаваў беларускі лідэр. Рэйтынгавая мэта з'явілася яшчэ ў 2008 годзе. За гэты час было прынята 80 нарматыўных актаў, што прывяло да абмежаванай лібералізацыі інвестыцыйнага клімату і насамрэч пасунула пазіцыю дзяржавы ў рэйтынгу *Doing Business Report* Сусветнага банка на 24 пункты — да 58-га месца.

Першая хваля лібералізацыі ўмоў бізнесу ў 2007–2008 гадах стала магчымай шмат у чым дзякуючы супрацоўніцтву ўрада Беларусі з Сусветным банкам і Міжнароднай фінансавай карпарацыяй, якая кансультавала кіраўніцтва дзяржавы па пытаннях спрашчэння працэдур рэгістрацыі прадпрыемстваў і стварэнні стартавых умоў для вядзення бізнесу. Далейшы пад'ём Беларусі ў рэйтынгу бізнес-клімату патрабуе рэформ у сферах крэдытавання, падаткаабкладанні, абароны інвестараў і ўмоў вядзення знешняга гандлю. Аналітычны даклад эксперты BISS называюць своеасаблівай «шпаргалкай» беларускаму ўраду па «накачванню» рэйтынга, і падкрэсліваюць, што ён хутчэй арыентаваны на метадалогію Сусветнага банка, чым на рэальныя патрэбы беларускай эканомікі.



У падатковай палітыцы эксперты прапануюць спрасціць і стабілізаваць заканадаўства, знізіць сацыяльныя падаткі і адлічэнні, пашырыць практыку электроннага дэкларавання. У міжнародным гандлі — прызнаць у Беларусі дакументы, выдадзеныя прызнанымі органамі сертыфікацыі іншых краін, спрасціць правілы, якія пацвярджаюць перамяшчэнне тавараў, адмяніць ці спрасціць статыстычнае дэкляраванне, а таксама адмяніць валютны кантроль банкамі. Таксама робіцца акцэнт на неабходнасці стварыць рыначныя і дзяржаўныя інстытуты, якія спрашчаюць доступ суб'ектаў гаспадарання да крэдытаў, развіваць канкурэнцыю на рынку банкаўскіх паслуг.

BISS адзначае неадназначнасць некаторых аспектаў метадалогіі, што выкарыстоўваецца ў *Doing Business Report*. Гэта дазваляе ўраду Беларусі паспяхова карыстацца наяўнымі нішамі і ажыццявіць «фасадную надстройку эканамічных інстытутаў пад чаканні знешніх гульцоў». Пераадоленне глыбінных фактараў, якія тармозяць стварэнне ў Беларусі сапраўды свабоднай рынкавай эканомікі, запатрабуе фундаментальных рэформ і перагляду ўсяго комплексу падыходаў дзяржавы да кіравання эканомікай і адносінам з прыватным бізнесам.

«Аднак у тым, што адбываецца, мы бачым нейкі эвалюцыйны патэнцыял. Палавінчатыя рэформы, якія здзяйсняюцца ў іміджавых мэтах, могуць мець станоўчы эфект для краіны ў цэлым. Гэта — пэўная эвалюцыя эканамічнай палітыкі, мадэрнізацыя мыслення кіруючай эліты краіны і паслабленне антырынкавай рыторыкі стэрэатыпаў у беларускім грамадстве, — адзначае аналітык BISS, кіраўнік аўтарскага калектыву дакладу Аляксей Пікулік. — Рэйтынг *Doing Business Report* можа быць скарэляваны і выкарыстоўвацца іншымі рэйтынгамі і інвестыцыйнымі агенцтвамі, што ў некаторай ступені ўплывае на прывабнасць для інвестараў. Таму, «накачаўшы» рэйтынг, можна чакаць пэўную станоўчую дынаміку ў прыцягненні ў краіну інвестыцый».

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву Сяргей Сямашка запэўнівае, што ў парламенце да рэйтынга няма асаблівай прыязнасці. «У нас няма такога глыбока «пакланення» рэйтынгу. Так, Міністэрства эканомікі і Савет міністраў займаюцца пытаннямі паляпшэння рэйтынгу, і сёння кіраўнік Беларусі зноў паставіў перад урадам задачу ўвайсці ў «трыццатку». Але ў нас ідзе нармальны заканатворчы працэс. Ёсць там пункты, датычныя рэйтынгу, але не так гладка яны праходзяць і не ўсё, што было прапанавана па паляпшэнні рэйтынгу будзе ўключанае.

Разам з тым пастаянны прадстаўнік Сусветнага банка ў Беларусі Іван Велеў зазначыў, што Сусветны банк распаўсюдзіў заяву, паводле якой рэйтынг краіны не мусіць адбівацца на рэсурсах, якія яна атрымлівае, хаця і не выключае факту таго, што высокае месца ў рэйтынгу спрыяе інвестыцыйнаму працэсу.

«Любая станоўчая інфармацыя ўспрымаецца добра. Інвестары, якія раней прыглядаліся да Беларусі, цяпер ведаюць, што тут невысокі ўзровень карупцыі ў дзяржорганах, ёсць рынак кваліфікаванай рабочай сілы, развітая інфраструктура... Але інвестары кіруюцца як рацыянальнымі, так і ірацыянальнымі крытэрамі ў сваіх рашэннях. Таму нават калі Беларусь патрапіць у дзесятку *Doing Business Report*, гэта не будзе роўна эластычнасці інвестыцыйнай прывабнасці, умоўна кажучы, дзесятае месца не азначае аўтаматычнае павелічэнне колькасці інвестараў у дзесяць разоў. Мусіць быць сукупнасць фактараў», — падкрэслівае прадстаўнік Сусветнага банка.

САМАКІРАВАННЕ

# ПАЎНАМОЦТВЫ ПІСАРАЎ — ДЭПУТАТАМ

**З паняццем «самакіраванне» Беларусь знаёмая яшчэ з часоў ВКЛ. Але за апошнія сто гадоў гэта «дурасць» была выбітая з мясцовых жыхароў, і цяпер да актыўнасці асобных грамадзян у лепшым выпадку ставяцца паблажліва. У горшым — караюць, каго псаваннем рэпутацыі і нерваў, а каго і крымінальным праследам. Перад мясцовымі выбарамі на кандыдата ў дэпутаты Гродзенскага абласнога і Мастоўскага раённага Саветаў Алеся Зарэмбюка завялі крымінальную справу. Агітацыйная кампанія міксуецца з вобшукамі і допытамі.**



Упраўленне КДБ па Гродзенскай вобласці завяло на Алеся Зарэмбюка крымінальную справу па артыкулу 209 частка 2 «Махлярства». «Беларускі рэжым цяпер не заводзіць крымінальныя справы супраць прадстаўнікоў апазіцыі па палітычных артыкулах. І мая гісторыя, і гісторыя Аўтуховіча, і справа Андрэя Бандарэнкі, які балатаваўся ў парламент у 2008 годзе, пацвярджаюць гэта», — мяркуе кандыдат у дэпутаты мясцовага савету. Пасля вобшуку дома ў Алеся і яго бацькоў былі забраныя кампутар, банкаўскія карткі на яго імя, візітоўкі партнёраў, улёткі і нават значкі. Апошнія, несумнеўна, з'яўляюцца важным рэчавым доказам у расследаванні справы аб махлярстве.

Разам з Зарэмбюком «пад раздачу» патрапіў яшчэ адзін кандыдат у дэпутаты Мастоўскага райсавета Васіль Клімовіч. Яго выклікалі ў абласное ўпраўленне КДБ на допыт у якасці сведкі. У агульнаеўрапейскіх палітычных умовах гэта можна было б назваць «чорным піярам», у беларускіх — ужываецца вызначэнне «праслед».

Але падобныя дэтэктыўныя гісторыі наўрад ці цікавяць выбарцаў. «Большасць грамадзян не да канца разумеюць сэнс такога паняцця, як «самакіраванне», не разумеюць, што самі мусяць вырашаць мясцовыя праблемы і вызначаць, якім чынам ім жыць далей. Сацыяльна-палітычныя ўмовы не спрыяюць развіццю ініцыятывы і разуменню таго, што гарады і рэгіёны незалежна ад цэнтральнай улады мусяць самастойна вырашаць пытанні мясцовага значэння, — дзеліцца сваімі назіраннямі малады палітык. — Цяпер пасля крымінальнай справы людзі падумаюць, што я вар'ят. Жыў бы, як усе, не займаўся б палітыкай, і ўсё было б добра».

— Тое, што ў Беларусі называецца самакіраваннем, зусім не адпавядае класічнаму разуменню гэтага тэрміна ў еўрапейскай практыцы, — разважае Алесь Зарэмбюк, які, дарэчы, цяпер вучыцца ў магістратуры ЕГУ на курсе «Публічная палітыка». — У нас і мясцовыя саветы і дэпутаты мясцовых саветаў не валодаюць ніякай уладай і па вялікаму рахунку мала на што ўплываюць. Напрыклад, у Літве са складу дэпутатаў савета абіраецца мэр горада, які стварае выканкам і можа рэалізоўваць перадвыбарчую праграму большасці савета.

Увогуле, дэмакратычныя краіны ратыфікавалі паміж сабой Еўрапейскую хартыю аб мясцовым самакіраванні, якая гарантуе палітычную, фінансавую і адміністрацыйную незалежнасць органаў мясцовага самакіравання. У Беларусі дэпутат мясцовага савета — гэта перш за ўсё статус, які дазваляе звяртацца ў любыя дзяржаўныя ўстановы і атрымліваць тлумачэнні. Адсутнасць такога статуса дазваляе мясцовым уладам па-хамску адпісвацца па той ці іншай праблеме, з чым мне неаднаразова даводзілася сутыкацца.

У Беларусі не існуе самакіравання, што вельмі моцна змяншае эфектыўнасць працы на лакальным узроўні і не дазваляе беларускім рэгіёнам быць самастойнымі ад цэнтральнай улады. Напрыклад, для Мастоў найбольш актуальныя з'яўляюцца праблемы беспрацоўя, якасці медабслугоўвання, паслуг ЖКГ. Але прававы статус мясцовых саветаў не дазваляе ім выконваць ролю самастойных органаў улады, таму, па вялікаму рахунку, не можа быць праблемаў, якія знаходзяцца выключна ў кампетэнцыі мясцовых саветаў».

У такіх умовах, на погляд Алеся, заслужыць давер выбарцаў і павагу улады ўсе ж мажліва — сістэмнай працай над вырашэннем звычайных, часам вельмі лакальных праблем.

«Асноўная работа дэпутата мясцовага савета ў Беларусі — гэта пастаянная перапіска па той ці іншай праблеме з рознымі ўстановамі і дзяржаўнымі інстытутамі, збор подпісаў жыхароў пад калектыўнымі зваротамі з патрабаваннем вырашэння праблемы. Па-іншаму ў Беларусі немагчыма дамагацца вырашэння мясцовых праблемаў, толькі правядзенне сустрэчаў, збор подпісаў і шматгадовая перапіска», — робіць Алесь высновы з уласнага дэпутацкага досведу. — Аднак супярэчнасці ў поглядах на дзяржаўны лад не перашкаджаюць многім асобам з другога боку ідэйных барыкад мець добрыя стасункі з апанентамі, што ў прынцыпе тыпова для нашых рэалій. Усё ж свае людзі, не чужыя. Любая ініцыятыва, якая ідзе не ад улады ці не падтрыманая ёй, не вітаецца. Выканкам вельмі раўніва ставіцца да перацягвання зонаў уплыву. А так, асабістыя кантакты з чыноўнікамі і супрацоўнікамі выканкама вельмі файныя, людзі ўсё разумеюць, але ж, на жаль, нічога не могуць зрабіць. Толькі ўздыхаюць і паціскаюць плячыма».

З НАГОДЫ

# Барыс Кіт: Я ЗАЎЖДЫ НАЗЫВАЎ СЯБЕ БЕЛАРУСАМ

Генадзь КЕСНЕР

◂ Заканчэнне. Пачатак у №№ 13,14

**6 красавіка споўнілася 100 гадоў самаму знакамітаму беларусу свету — выбітнаму навукоўцу і грамадскаму дзеячу Барысу Кіту. Пры канцы сакавіка ў Франкфурце-на-Майне (Германія), дзе сёння жыве чалавек-легенда, з юбілярам сустрэліся рэдактар навін парталу TUT.BY Кастусь Лашкевіч і карэспандэнт «НЧ» Генадзь Кеснер. Гутарка з Барысам Кітом доўжылася амаль дзве гадзіны. Сёння вашай увазе — заключная частка інтэрв'ю.**



***— Барыс Уладзіміравіч, сёлета Ваш юбілей адзначаюць, бадай, ва ўсім свеце. На Вашай малой радзіме таксама Вас ушаноўваюць, прычым не толькі грамадскасць, але і мясцовыя ўлады. Чаму па сутнасці антыбеларуская ўлада вырашыла ўшанаваць Вас — яскравага барацьбіта за беларускасць?***

— Яны бачаць, што я нічога дрэннага не раблю і нічым ім не пагражаю. Я ўсё ж сусветны чалавек і не зрабіў нічога такога, што магло б ім не падабацца. Калі мяне ўвесь свет шануе, то чаму яны не павінны мяне шанаваць? (*смяецца*)

Дарэчы, мне ўжо навезлі ўсялякіх падарункаў. Многія хацелі, каб я паехаў святкаваць юбілей у Мінск, але я для гэтага ўжо вельмі слабы. Былі прапановы, што дадуць цэлую санітарную машыну, каб забраць мяне, нават разам з доктарам…

Вельмі шкада, што да майго юбілею не дажыў мой старэйшы сын Уладзімір. Ён нават перасягнуў мяне, ён быў асістэнтам кіраўніка НАСА ў Вашынгтоне. Уладзімір памёр 4 лістапада 2009 года ад рака… Гэтая хвароба ні да каго не прыглядаецца…

Мой малодшы сын таксама выдатны чалавек, ён знакаміты амерыканскі хірург, жыве і працуе ў ЗША ў Балціморы. Але, у адрозненне ад Уладзіміра, ён нарадзіўся ўжо ў Амерыцы, у Лос-Анжэлесе. Я ганаруся маімі дзецьмі, яны, дарэчы, ніколі мяне не прасілі дапамагчы ім па матэматыцы. (*смяецца*)

Мой старэйшы сын першакласна гаварыў па-беларуску. У 1968 годзе ён і яго жонка былі прызначаны кіраваць амерыканскай выставай архітэктуры ў Савецкім Саюзе. Яны паездзілі па ўсіх сталіцах, і ў Мінску былі. І вось выходзіць мой сын і звяртаецца да ўсіх чыста па-беларуску. Усе былі вельмі здзіўленыя! (*смяецца*)

***— Што распавядаў Вам Уладзімір пасля той паездкі?***

— Ну, Савецкі Саюз заўсёды быў ніжэйшы за Амерыку, але ён прыехаў вельмі прыязны, ён палітыкай не займаўся… Дарэчы, мой сын быў і чэмпіёнам Амерыкі па тэнісе. Дык ён і ў Маскве, і ў Пецярбургу гуляў у тэніс з расейцамі. Я б вельмі хацеў, каб хто-небудзь напісаў пра яго кнігу. Сын быў асістэнтам міністра, кіраваў аднэй галіной — як перадаваць усе адкрыцці НАСА ў Еўропу. Адным словам, беларус, якім можна было ганарыцца.

Смерць Уладзіміра — гэта самае горшае, што я перанёс у апошнія часы. Вы ведаеце, як на бацьку гэта дзейнічае… Бацька напалову памірае, таксама і я напалову ўжо памёр…

У мяне зараз дзве ўнучкі і два праўнукі. Мая старэйшая ўнучка Марына таксама выдатная асоба ў Амерыцы. Яна была і знакамітай тэнісісткай, а таксама балерынай, яна скончыла балетную школу у Вашынгтоне. У Вашынгтон прыязджалі знакамітыя балеро, напрыклад, Нурыеў, вось менавіта праз яе я і пазнаёміўся з Нурыевым. Было так: яны прыехалі і рабілі цэлы спектакль у Вашынгтоне. Пасля смерці Кенэдзі там збудавалі новую вельмі прыгожую залю. І я прыехаў у Вашынгтон. Унучка мне кажа: сёння я буду выступаць разам з Нурыевым. Я паглядзеў выступ і пайшоў за кулісы. І яна выходзіць за кулісы, абняўшыся з Нурыевым, і кажа: дзядуля, дазвольце вам прадставіць Нурыева. (*смяецца*)

***— Барыс Уладзіміравіч, сто гадоў — гэта больш чым паважная дата. Ці маеце Вы нейкія свае рэцэпты доўгажыхарства?***

— Я не маю ніякіх рэцэптаў. Усе ішло як ішло, многа было элементаў. Першае, магчыма, што я — беларус, гэта такія прыродныя элементы, генетыка беларуская. Далей, я ўсё жыццё меў такую прыгожую дзейнасць, і калі я быў настаўнікам, і калі быў вучоным — гэта таксама вельмі добрыя элементы. Можа, тут яшчэ і тое, што маё жыццё спачатку было вельмі цяжкое, я многа галадаў, а гэта добра, бо калі галадуеш, тады не псуецца арганізм. І самае, можа, важнае — чыстае сумленне, духовае. Я нікому не зрабіў ніякага зла. Я ніколі не быў салдатам, не браў удзел у войнах. Выкруціўся ад дрэнных магчымасцяў і дажыў да ста гадоў.

***— А распавядзіце пра свой штодзённы графік: як Вы бавіце час, калі ўздымаецеся?***

Я мяне ёсць пэўныя цяжкасці — такая хвароба астэахандроз. Што яна робіць: як ляжаш — суставы ўжо разышліся і сціскаюць нервы, з-за гэтага баляць ногі і не даюць спаць. Ногі «гараць», і тады ўстаеш, таму я не магу спаць наскрозь цэлую ноч, мушу ўставаць некалькі разоў.

Звычайна я ўздымаюся а 8-й ці а 9-й гадзіне. Потым, як стамлюся, крыху прылягу — я ўжо стары чалавек. Але я яшчэ вельмі добра хаджу, кожны вечар я еду на спатканне са сваёй сяброўкай Тамарай, і мы з ёй разам робім гімнастыку — я раблю «чаплю» ці тупаю нагамі, у мячык гуляем, гэта на вуліцы, а ў хаце робім усялякія гульні для мазгоў. Вось гэта і падтрымлівае мяне, таму я яшчэ і жыву. Нічога не рабіць — гэта дрэнь! Тады ўжо хутка прыйдзе смерць.

Дарэчы, я ўсё раблю сам, у тым ліку і закупы, ніхто за мной не даглядае. І гэта займае ўвесь дзень — нешта капаюся, плюс пішу лісты, тэлефаную, займаюся архівізмам — вунь, стаіць цэлы чамадан маіх усялякіх артыкулаў, кніг, і я ўсё думаю, як гэта ўсё выслаць на Беларусь. У музеі ў Навагрудку ўжо поўна маіх матэрыялаў, цяпер хачу накіраваць у Мінск. Там у вас ёсць нацыянальны архіў, з Галінай Шостак я ў цудоўных адносінах. Яна вельмі добра падае матэрыялы ў інтэрнэце, прычым не толькі па-беларуску, але і па-англійску. Вось гэта добра, бо па-англійску чытаюць усе…

Я дзякую Богу, што я некаму дапамагаю. Гэта так важна — дапамагчы беднай Беларусі, Бацькаўшчыне, загнанай вякамі, падняць яе, давесці ўсім, што беларусы таксама нечага вартыя на свеце!

***— Барыс Уладзіміравіч, ці магчыма ў перспектыве Беларусь як незалежная дзяржава без беларускай мовы? Ці будзе гэта Беларусь, калі не будзе беларускай мовы?***

— Я думаю, што вось і сёння дзве мовы, беларуская і руская, ну і добра, і няхай. Толькі адна беларуская мова — гэта цяжка. Таму што беларуская мова не ёсць сусветная мова. А ўжо расійскую трэба лічыць сусветнай мовай, з ёй ужо можна камунікавацца з усім светам. Самае важнае, што беларуская моладзь вучыць мовы, але трэба ўлічыць, што сёння самая важная ў свеце — англійская мова. І было б вельмі добра ва ўсіх школах вывучаць англійскую мову.

Я калісьці хацеў закласці універсітэт еўрапейскага тыпу, але цяпер сітуацыя змянілася…

Увесь свет спачувае Беларусі, і хочацца дапамагчы, але ніхто не хоча ўлазіць у ваенныя канфлікты з Беларуссю, бо вайна — гэта паскудства. Таму робяць тое, што могуць. Вашы вучні вучацца і ў Вільні, і ў Варшаве, і я маю сувязі і там, я маю сяброў па ўсім свеце. А ў Вільні асабліва, бо я там жыў доўгі час. Я там, а таксама ў Беластоку, у Варшаве апошні раз быў у 1995 годзе. У мяне вялікія сябры там. Напрыклад, у Шчэціне жыве мая хросніца, яна дачка паэта Хведара Ільяшэвіча, які працаваў са мной разам у Віленскай беларускай гімназіі. Ён быў маім закадычным сябрам. І муж маёй хросніцы — цудоўны чалавек, былы рэктар Медыцынскай акадэміі ў Шчэціне, ён быў дарадчыкам Валенсы. Вось такая публіка!

Я ж скончыў у Польшчы універсітэт, і разам са мной вучыліся тыя, хто потым стаў у Польшчы вялікімі людзьмі, нават міністрамі. Адзін мой віленскі вучань, беларус, быў нават беластоцкім губернатарам і дарадчыкам Гамулкі. Аднойчы Акадэмія навук Амерыкі на месяц выслала мяне ў Польшчу як госця-прафесара, і я выкладаў у Кракаўскім універсітэце.

***— А што гэта за ўзнагарода, якую Вы атрымліваеце да юбілею?***

— Гэта залаты медаль Вернера фон Браўна, ён уручаецца «за выбітную дзейнасць у астранаўтыцы», за вялікі ўнёсак у астранаўтыку. Тое, што я выдаў першую кнігу ў гэтай галіне, таксама з'яўляецца адным з такіх унёскаў. І гэтай кнігай карыстаюцца і сёння. Мая кніга — гэта і тэорыя, і даведнік.

Што да маёй педагагічнай дзейнасці, то я тут, у Германіі, дваццаць год быў прафесарам амерыканскага Мэрылендскага універсітэта, у Беларусі я выпусціў пяцьдзесят тысяч вучняў, а будучы амерыканскім прафесарам, я выпусціў сто тысяч чалавек.

І яшчэ што да гэтай узнагароды. Як я прыехаў у Германію, дык немцы ляжалі на лапатках пасля вайны. Тады я пазнаёміўся з выдатнымі мясцовымі вучонымі, ездзіў на іх кангрэсы, і яны потым казалі, што я зноў узняў іх астранаўтычны дух, ракетны дух, бо іхны ракетны дух упаў пасля таго, як іх пабілі.

***— А дзе было лягчэй працаваць — у Амерыцы ці ў Германіі?***

— У Германіі я быў прафесарам, выкладаць было вельмі лёгка. Шчыра скажу, я вёў дзве працы — даследчую і педагагічную. Натуральна, латвейшай рабіць педагагічную працу. І ў Амерыцы, і ў Германіі. Даследчая праца — гэта вельмі цяжка, трэба паказаць сябе, паказаць матэматыку, такія цяжкія заданні — усё вырахаваць, а матэматыкі ўсё робяць першыя. Пры ўсіх важных праектах кіраўнік спачатку ідзе туды, дзе сядзяць матэматыкі: «Грамадзяне, у нас ёсць такая ідэя, вырахуйце, ці можна гэта зрабіць?» Матэматыкі цэлы месяц працуюць, і потым зноў прыходзіць кіраўнік: «І што?» — «Можна!» Тады гэтая думка ўжо ідзе да інжынераў, а інжынеры без матэматыкаў не абыдуцца. Матэматыкі прыходзяць на пасяджэнні інжынераў, а інжынеры — на пасяджэнні матэматыкаў. Дык інжынеры кажуць: як вы, матэматыкі, прыходзіце на нашы сходы, дык вы ўсё разумееце, а як мы прыходзім на вашы, матэматыкаў, сходы, мы разумеем далёка не ўсё (*смяецца*).

Я ўжо быў стары, выйшаў на пенсію, але ездзіў па ўсім свеце і часта заязджаў у амерыканскі універсітэт тут, у Германіі, да сваіх сяброў. І яны ведалі, што я на пенсіі, і запрасілі мяне, калі я ўжо быў пенсіянерам, сюды, у Германію, працаваць: будзеце ў нас прафесарам, гэта ўжо будзе не такая абавязкавая праца. Вось я стаўся і тут прафесарам.

Чаму менавіта ў Германіі? Наш Мэрылендскі універсітэт — гэта быў такі універсітэт, які служыў для амерыканскіх узброеных сілаў ва ўсім свеце. Ваенны міністр вырашыў, што нейкі універсітэт мусіць даць такі школьны, педагагічны сервіс усёй арміі, усім амерыканскім узброеным сілам у свеце. Наш Мэрылендскі універсітэт ёсць і ў Японіі, і паўсюль, дзе толькі ёсць амерыканскія войскі. Мне спадабалася, што тут працуюць блізкія мне людзі, таму я і прыехаў у Нямеччыну. А я мог выкладаць і ў Японіі, ці нават у В'етнаме, калі там была вайна. Нашы філіялы былі паўсюль, дзе вялася вайна. Бачыце, як амерыканская дзяржава клапацілася пра сваіх маладых салдат, каб яны не марнавалі часу, але вучыліся і вучыліся, яна давала ім такую магчымасць.

***— І на заканчэнне нашай гутаркі, што б Вы, Барыс Уладзіміравіч Кіт, пажадалі беларусам?***

— Быць шчаслівымі! Каб усё павярнулася так, каб яны былі шчаслівымі. Рабіць сваю беларускую справу, не пераставаць змагацца за яе. А маладым — вучыцца, і яшчэ раз вучыцца, як найболыш! Бо праз навуку можна прайсці ў свет.

***— Велічэзны дзякуй Вам, Барыс Уладзіміравіч, і добрага Вам здароўя яшчэ на многія гады!***

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 26 КРАСАВІКА, ПАНЯДЗЕЛАК

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.05, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** У свеце матораў.
**09.05** Nota Bene.
**09.35** «Зорныя танцы». Мужчынскі сезон.
**10.50** OFF STAGE LIFE.
**11.05** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**12.10** Дакументальны цыкл «Вялікая вайна» (Расія-Украіна). Фільм «Сталінград».
**13.10** Ваенная кінаэпапея «Вызваленне» (СССР-ГДР-Польшча).
**14.45** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**16.25** Серыял «Агні вялікага горада».
**17.25** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.25** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна».
**19.55** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.55** Адмысловы рэпартаж АТН «Аб'ект адмысловага значэння».
**22.05** Вострасюжэтная ваенная драма «Застава Жыліна» (Расія).
**23.10** Фантастычны серыял «Героі-3» (ЗША).
**00.05** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** Камедыя «На Дзерыбасаўскай добрае надвор'е, або На Брайтан-біч ізноў ідуць дажджы».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Працяг фільма « На Дзерыбасаўскай добрае надвор'е, або На Брайтан-біч ізноў ідуць дажджы».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** Прэм'ера. «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** АНТ прадстаўляе: «Міс Беларусь - 2010».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня». Пасля вяселля, 2008 год.
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Выбар».
**22.00** «Застацца ў жывых». Шматсерыйны фільм. IV-ы сезон. 11-я серыя.
**23.00** Нашы навіны.
**23.15** Навіны спорту.
**23.20** «Злачынствы стагоддзя».
**23.55** Матафрыстайл. Чэмпіянат свету.
**00.50** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**01.15** Нашы навіны.
**01.30** Навіны спорту.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** «Вялікі горад».
**15.40** «Гарачы лёд».
**16.05** «Культурнае жыццё».
**16.50** «Дабро пажаліцца».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Руская гульня». Расія, 2007г.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** Фільм «Забіць Біла».ЗША, 2003г.

---

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.45** Камедыя «Алекс і Эма» (ЗША).
**12.25** «Пра мастацтва».
**12.55** Школа рамонту.
**13.55** Драма «Я памятаю…» («Беларусьфільм»).
**15.25** Пазакласная гадзіна.
**15.40** Бухта капітанаў.
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**20.05** Беларуская часіна.
**21.10** Калыханка.
**21.30** Вялікае сэрца.
**22.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**22.35** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**23.30** Хакей. Формула гульні.

---

РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Прэм'ера. «Мікіта Карацупа. Следапыт з легенды».
**10.10** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**11.00** Весткі.
**11.25** «Ранішняя пошта».
**12.00** Фільм «Паўночнае ззянне».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** Фільм «Вяртанне блуднага таты».
**16.05** Прэм'ера. «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.25** Тэлесерыял «Іван Грозны». Расія.
22.20 Тэлесерыял «Дворык_».
**22.55** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**23.50** «Нічога асабістага».
**00.05** Навіны - Беларусь.
**00.15** «Весткі+».
**00.35** «Мой срэбны шар».

---

НТВ

**07.00, 10.00, 13.00, 19.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Праграма Максімум».
**09.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** Дэтэктыўны серыял «Шпікі».
**13.30** Серыял «Таксістка».
**15.05** «Выратавальнікі».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** Дэтэктыўны серыял «Вісякі».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Кодэкс гонару».
**21.35** Вострасюжэтны серыял «Ментоўскія войны».
**23.30** Сёння.
**23.55** «Сумленны панядзелак».
**00.45** «Школа зласлоўя».

---

EUROSPORT

**09.30** Матаспартыўны часопіс.
**09.45** Суперспорт. Чэмпіянат свету. Асэн (Нідэрланды).
**10.30** Супербайк. Чэмпіянат свету. Асэн (Нідэрланды). Заезд 2.
**11.15** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 9.
**12.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 10.
**15.00** Веласпорт. Велагонка Льеж-Бастон-Льеж. Бельгія.
**16.25** «Планета Армстронг». Часопіс.
**16.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 10.
**19.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**20.15** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**21.15** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Бразілія і Аргентына. Часопіс.
**21.50** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**00.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 10.

---

БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**17.35** Госць «Белсату».
**17.50** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.45** «Верыць толькі ветру», дак. фільм.
**19.15** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.25** Мультсерыял.
**19.35** Еўропа сёння.
**20.00** ПраСвет.
**20.15** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Пах смерці», дак. фільм, 1994 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Прыватная калекцыя.
**21.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**21.55** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**22.05** «Метад», маст. фільм, 2005 г.

## 27 КРАСАВІКА, АЎТОРАК

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Арэна.
**09.05** Дэтэктыў «Апостал» (Расія).
**10.00** Серыял «Агні вялікага горада».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Адмысловы рэпартаж АТН «Аб'ект адмысловага значэння».
**12.10** Ваенная кінаэпапея «Вызваленне» (СССР-ГДР-Польшча).
**13.45** «OFF STAGE LIFE».
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Беларускі біятлон. Папраўка на вецер».
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Сяброўка адмысловага прызначэння» (Расія). Заключная серыя.
**16.50** Серыял «Агні вялікага горада» (Расія). Заключная серыя.
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Дэтэктыў «Апостал» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Ліён-Баварыя. Прамая трансляцыя.
**00.05** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**10.00** Фільм «Музыка жыцця». Частка 2.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** Прэм'ера. «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня». Пасля вяселля, 2008 год.
**19.00** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Шлюб па завяшчанні». Шматсерыйны фільм.
**22.15** Шматсер. фільм «Катоўскі». Расія.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Зваротны адлік».
**00.05** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.50** Нашы навіны.
**01.05** Навіны спорту.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Фільм «Руская гульня». Расія, 2007г.
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Гучная справа».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.40** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Водблiскi». Серыял.
**22.55** «Ля парадната пад'езду».
**23.25** «Аўтапанарама».
**23.45** Фільм «Воблака 9». ЗША, 2006г.

---

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.40** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**11.40** «Запал па культуры».
**12.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**13.20** Хакей. Формула гульні.
**13.45** Лабірынты: першадрукар Іван Фёдараў.
**14.20** Вострасюжэтная меладрама «Тэрарыстка Іванова» (Расія). 1-я серыя.
**15.15** Мультфільм.
**15.25** Пазакласная гадзіна.
**15.40** Свая кампанія.
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**20.05** Беларуская часіна.
**21.10** Калыханка.
**21.30** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**22.05** Спорт-кадр.
**22.35** Вестэрн «Вогненная зямля» (Італія-Іспанія-Чылі).

---

РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** Прэм'ера. «Навука перамагаць. Подзвіг камбата». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** «Нічога асабістага».
**11.40** Тэлесерыял «Іван Грозны». Расія.
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**15.15** Тэлесерыял «Чырвоная капэла».
**16.05** Прэм'ера. «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.25** Тэлесерыял «Іван Грозны». Расія.
**22.20** Тэлесерыял «Панадворак».
**22.55** Прэм'ера. «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял. Расія, 2009 г. Закл. серыя.
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі+».
**00.20** Прэм'ера. «Вызваліцелі». «Пяхота». Дакументальны фільм.

---

НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.30** «І зноў добры дзень!».
**09.25** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.55** «Кватэрнае пытанне».
**12.00** Дэтэктыўны серыял «Шпікі».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Таксістка».
**15.10** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** Дэтэктыўны серыял «Вісякі».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Кодэкс гонару».
**21.35** Вострасюжэтны серыял «Ментоўскія войны».
**23.30** Сёння.
**23.55** «Позняя гутарка».
**00.40** «Фатальны дзень».

---

EUROSPORT

**09.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.15** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**11.15** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 10.
**12.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 1/4 фіналу.
**15.00** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт (Германія). Дзень 2.
**16.45** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 1/4 фіналу.
**19.30** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт (Германія). Дзень 2.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт (Германія). Дзень 2.
**21.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 1/4 фіналу.
**00.00** Экстрэмальныя віды спорту. Free Ride Spirit.
**00.15** Матаспартыўны часопіс.
**00.30** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі WBO. Германія.
**01.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 1/4 фіналу.

---

БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**17.40** МакраФон: «Новая традыцыя», канцэрт гуртоў «Таўгая» і «Яр».
**18.15** Басанож па свеце.
**18.45** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.20** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма).
**19.30** «Прыгоды ката Філемона», мультсерыял.
**19.40** Праект «Будучыня».
**20.10** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма).
**20.40** Хто ёсць кім?: Алесь Лось.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Сальда (эканамічная праграма).
**21.35** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**21.45** «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
**22.35** Форум (ток-шоў): «Нябачная вайна».
**23.20** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 28 КРАСАВІКА, СЕРАДА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05** Дэтэктыў «Апостал» (Расія).
**10.00** Меладраматычны серыял «Агні вялікага горада» (Расія). Заключная серыя.
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Відэафільм АТН «Мядзельскія выток» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Ваенная кінаэпапея «Вызваленне» (СССР-ГДР-Польшча).
**14.20** Хакей для ўсіх.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Альманах вандраванняў.
**15.50** Дэтэктыўны серыял «Міф аб ідэальным мужчыне» (Расія). 1-я серыя.
**16.50** Прэм'ера. Меладраматычны серыял «Агульная тэрапія» (Расія). 1-я серыя.
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.40** Адмысловы рэпартаж АТН «Жывыя легенды рамёстваў».
**19.50** Дэтэктыў «Апостал» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Паўфінал. Барселона-Інтэр. Прамая трансляцыя.
**00.05** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Катоўскі». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** Прэм'ера. «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня». Пасля вяселля, 2008 год.
**19.00** «Слова жанчыне». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Шлюб па завяшчанні». Шматсерыйны фільм.
**22.15** Прэм'ера. Шматсерыйны фільм «Катоўскі». Расія, 2010 год.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Дакументальны дэтэктыў».
**00.05** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.50** Нашы навіны.
**01.05** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.35** «Водбліскі». Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Водбліскі». Серыял.
**22.55** «Мінск і мінчане».
**23.25** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**23.50** Фільм «7 гномаў». Германія, 2004г.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.40** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**11.40** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.25** Спорт-кадр.
**13.00** Вострасюжэтная меладрама «Тэрарыстка Іванова» (Расія). 2-я і 3-я серыі.
**14.40** Пазакласная гадзіна.
**15.00** Медычныя таямніцы.
**15.25** Прыгодніцкі серыял «Чалавек вайны» (Расія). 1-я серыя.
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**20.05** Беларуская часіна.
**21.15** Калыханка.
**21.35** Моладзевы камедыйны серыял «Універ» (Расія).
**22.05** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Шахцёр - Днепр.

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** Прэм'ера. «Агент «Сябар» супраць Гітлера». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Іван Грозны». Расія.
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** Прэм'ера. «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял. Расія, 2009 г. Закл. серыя.
**15.15** Тэлесерыял «Чырвоная капэла».
**16.05** Прэм'ера. «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.25** Тэлесерыял «Іван Грозны». Расія, 2009 г.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Прэм'ера. «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял. 2009 г.
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі+».
**00.20** Прэм'ера. «Вызваліцелі». «Сапёры». Дакументальны фільм.
**01.10** Заканчэнне эфіру.

**07.00** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Следства вялі…».
**09.20** «Іх норавы».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.55** «Дачны адказ».
**11.55** Дэтэктыўны серыял «Шпікі».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Таксістка».
**15.05** «Галоўная дарога».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вісякі».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Кодэкс гонару».
**21.35** Вострасюжэтны серыял «Ментоўскія войны».
**23.25** «Следства вялі…».
**00.15** «Першая кроў».

**09.35** Экстрэмальныя віды спорту. Free Ride Spirit.
**09.45** Вось дык так!!!
**10.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**10.30** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт (Германія). Дзень 2.
**12.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 1/4 фіналу.
**15.00** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт (Германія). Дзень 3.
**16.45** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 1/4 фіналу.
**19.30** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт (Германія). Дзень 3.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт (Германія). Дзень 3.
**21.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 1/4 фіналу.
**00.00** Веласпорт. Велагонка Льеж-Бастон-Льеж. Бельгія.
**01.25** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**01.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 1/4 фіналу.

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**17.40** «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
**18.30** Аблічча таталітарызму: «Падзенне жалезнай заслоны», 2009 г., Германія: 2 серыя, «Абвінаваўца Чаўшэску».
**19.25** «Прыгоды ката Філемона», мультсерыял.
**19.40** На колах.
**20.10** «Чатыры сымбалі», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Маю права (прававая праграма).
**23.30** Аб'ектыў.

## 29 КРАСАВІКА, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.40, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.45** Відэафільм АТН «Прыкметны бізнэс».
**09.05** Дэтэктыў «Апостал» (Расія).
**10.00** Меладраматычны серыял «Агульная тэрапія» (Расія). 1-я серыя.
**10.55** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Алімпійскі часопіс.
**12.10** Ваенная кінаэпапея «Вызваленне» (СССР-ГДР-Польшча).
**13.45** Дакументальны цыкл «Фартыфікацыя» (Беларусь).
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Уласнай персонай.
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Міф аб ідэальным мужчыне» (Расія). 2-я серыя.
**16.50** Меладраматычны серыял «Агульная тэрапія» (Расія). 2-я серыя.
**17.55** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.25** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Дэтэктыў «Апостал» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.05** Вострасюжэтная ваенная драма «Застава Жыліна» (Расія).
**23.10** «Эпоха». «Мастак Барыс Забораў». Фільм 1-ы (Беларускае тэлебачанне).
**23.35** Фантастычны серыял «Героі-3» (ЗША).
**00.35** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Катоўскі». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** Прэм'ера. «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня». Пасля вяселля, 2008 год.
**19.00** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Шлюб па завяшчанні». Шматсерыйны фільм.
**22.15** Прэм'ера. Шматсерыйны фільм «Катоўскі». Расія, 2010 год.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** АНТ прадстаўляе: «Выбар +».
**00.00** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.45** Нашы навіны.
**01.00** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Я-вандроўца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Фантастычныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.40** «Водбліскі». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Водбліскі». Серыял.
**22.55** «Асабісты інтэрас».
**23.25** «Аўтапанарама».
**23.45** Фільм «Дэманстрацыя сілы».ЗША, 1990 г.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.40** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**11.40** Экспедыцыя.
**12.10** Бітва экстрасэнсаў.
**13.15** Вострасюжэтная меладрама «Тэрарыстка Іванова» (Расія). 4-я серыя.
**14.10** Мультфільм.
**14.30** Пазакласная гадзіна.
**14.45** Жывы гук.
**15.30** Прыгодніцкі серыял «Чалавек вайны» (Расія). 2-я серыя.
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**20.05** Беларуская часіна.
**21.10** Калыханка.
**21.30** Культасвет.
**22.00** Футбол. Ліга Еўропы. Паўфінал. Прамая трансляцыя.
**00.00** Час футболу.
**00.30** Футбол. Ліга Еўропы. Паўфінал.

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Маршал песні. Салаўёў-Сівы». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Іван Грозны». Расія.
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял. 2009 г.
**15.15** Тэлесерыял «Чырвоная капэла».
**16.05** Прэм'ера. «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.25** Тэлесерыял «Іван Грозны». Расія.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Прэм'ера. «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял. 2009 г.
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі+».
**00.20** Прэм'ера. «Вызваліцелі». «Штурмавікі». Дакументальны фільм.

**07.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.25** Праект «У пошуках Францыі».
**09.15** «Жаночы погляд».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.55** «Вочная стаўка».
**11.40** «Прафесія-рэпарцёр».
**12.10** Дэтэктыўны серыял «Шпікі».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Таксістка».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вісякі».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Кодэкс гонару».
**21.35** Вострасюжэтны серыял «Ментоўскія войны».
**23.20** Сёння.
**23.45** «Алтар Перамогі».
**00.35** «Асабліва небяспечны!».

**09.30** «Алімпійскія гульні». Алімпійскі часопіс.
**10.00** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт (Германія). Дзень 3.
**11.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 1/4 фіналу.
**13.00** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт (Германія). Дзень 3.
**15.00** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт (Германія). 1/8 фіналу.
**16.45** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 1/2 фіналу.
**19.00** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт (Германія). 1/8 фіналу.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт (Германія). 1/8 фіналу.
**21.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 1/2 фіналу.
**00.00** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**01.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 1/2 фіналу.

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**17.30** «Вясельныя клопаты», маст. фільм, 2001 г., ЗША–Германія.
**19.10** Сальда (эканамічная праграма).
**19.30** «Прыгоды ката Філемона», мультсерыял.
**19.40** Праект «Будучыня».
**20.05** МакраФон: «Рок-карона–2009», выбранае.
**20.35** Прыватная калекцыя.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Форум (ток-шоу): «Маці-адзіночкі».
**22.00** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял.
**22.45** Без рэтушы: «Чарнобыльскі шлях прафесара Бандажэўскага», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**23.05** Аб'ектыў.

## 30 КРАСАВІКА, ПЯТНІЦА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05** Дэтэктыў «Апостал» (Расія).
**10.00** Меладраматычны серыял «Агульная тэрапія» (Расія). 2-я серыя.
**10.55** Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія).
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Ваенная кінаэпапея «Вызваленне» (СССР-ГДР-Польшча).
**13.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**14.05** «Залаты лёд Страдзівары».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Шпілька.
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Міф аб ідэальным мужчыне» (Расія). 3-я серыя.
**16.55** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**18.05** Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія).
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Дэтэктыў «Апостал» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.55** Вострасюжэтная ваенная драма «Застава Жыліна» (Расія).
**22.45** «Эпоха». «Мастак Барыс Забораў». Фільм 2-і (Беларускае тэлебачанне).
**23.10** Драма «Імгненні жыцця» (ЗША).
**00.50** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсерыйны фільм.
**10.00** «Катоўскі». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** АНТ прадстаўляе: «Чакай мяне». Беларусь.
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** Прэм'ера. «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: VII Нацыянальны конкурс прыгажосці «Міс Беларусь-2010». Фінал.
**00.15** Наша «Белараша».
**00.45** Трылер «Жах Тарнада ў Нью-Йорку».
**02.20** Нашы навіны.
**02.35** Навіны спорту.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Мінdriшчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Сакрэтныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.40** «Водбліскі». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Асабісты інтэрас».
**17.20** «Мінчшчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «КВЗ. Першая ліга. 1/8 фіналу».
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.05** Фільм «Птушкі вайны». ЗША, 2008 г.
**01.30** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Час футболу.
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.35** У гэты дзень.
**09.40** Жансавет.
**10.10** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**11.15** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**12.15** Гаспадар.
**12.40** Вострасюжэтная меладрама «Тэрарыстка Іванова»(Расія). 5-я і 6-я серыі.
**14.20** Кінаспробы.
**14.35** Культасвет.
**15.05** Свая музыка. Працяг.
**15.30** Прыгодніцкі серыял «Чалавек вайны» (Расія). 3-я серыя.
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.30** Усё аб бяспецы.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Пра мастацтва.
**19.30** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**20.25** Калыханка.
**20.45** Бітва экстрасэнсаў.
**21.55** Дакументальны фільм «Два міністры ў адной спальні» (Расія).
**22.45** Крымінальны трылер «Бывай, каханая» (Італія- Францыя).
**00.40** Тэлепорт.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Іван Грозны». Расія, 2009 г.
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял. 2009 г.
**15.15** Тэлесерыял «Чырвоная капэла».
**16.05** Прэм'ера. «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.25** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**22.20** Навіны - Беларусь.
**22.30** Фільм «Ваш прыпынак, мадам!». Расія, 2008 г.



**00.20** Фільм «Шалёны дзень манцёра».
**01.30** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Алтар Перамогі».
**09.20** «Асабліва небяспечны!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.55** «І зноў добры дзень!».
**11.50** Дэтэктыўны серыял «Шпікі».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Таксістка».
**15.10** «Фатальны дзень».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вісякі».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі…».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.00** Прэм'ера. Вострасюжэтны фільм «Жорсткае каханне».
**23.00** Прэм'ера. «Шансон года-2010».

### EUROSPORT

**09.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 1/2 фіналу.
**10.30** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт (Германія). 1/8 фіналу.
**12.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 1/2 фіналу.
**15.00** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт (Германія). 1/4 фіналу.
**16.45** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 1/2 фіналу.
**19.30** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт (Германія). 1/4 фіналу.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт (Германія). 1/4 фіналу.
**21.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 1/2 фіналу.
**00.00** Ралі. Ралійная серыя IRC. Лас-Пальмас (Канарскія выспы/Іспанія). Дзень 1.
**00.30** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Украіна. Фінал.
**01.30** Экстрэмальныя віды спорту. Free Ride Spirit.
**01.45** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 1/2 фіналу.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**17.35** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**18.20** Форум (ток-шоу): «Мацi-адзіночкі».
**19.00** Маю права (прававая праграма).
**19.25** «Прыгоды ката Філемона», мультсерыял.
**19.35** На колах.
**20.00** Дакументальная гадзіна: «Усмешка на вуснах ды слёзы ў вачах», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Госць «Белсату».
**21.35** «Транзіт», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**22.05** «Ніжэй за лінію Казярога», маст. фільм, 1983 г., Аўстралія: 2 серыя.
**23.40** Аб'ектыў.

## 1 МАЯ, СУБОТА

**06.15** Мультфільм «Прыгоды Бураціна».
**07.20** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** Здароўе.
**09.40** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**10.35** Шпілька.
**11.05** Ранішняя хваля.
**11.45** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Камедыя «Па сямейных абставінах» (СССР). 1-я і 2-я серыі.



**14.40** Прэм'ера. Кароткаметражны фільм «Паплавок» (Расія).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.10** Канцэрт Н.Кадышавай і ансамбля «Залатое кольца».
**17.40** Відэафільм АТН «Мядзельскія вытокі» (з цыклу «Зямля беларуская».
**18.00** «Ваша лато».
**18.50** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зорныя танцы». Мужчынскі сезон.
**21.00** Панарама.
**21.40** Прэм'ера. Гістарычная драма «Крамаў» (Расія).
**23.50** Уласнай персонай.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**09.45** Фільм «Высакародны разбойнік Уладзімір Дуброўскі».
**11.45** Фільм «Вясна на Зарэчнай вуліцы».
**13.30** Тэлечасопіс «Звяз».
**14.00** «Кінаметры вайны».
**14.30** «Паляванне на аленяў». Мастацкі фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Леанід Філатаў. «Пра Фядота-стральца, заліхвацкага малайчыну».
**17.30** Юбілейны канцэрт Аляксандра Буйнова.
**18.55** «Адзін супраць усіх».
**19.55** АНТ прадстаўляе: «Чакай мяне». Беларусь.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Хвіліна славы». Гала-канцэрт.
**23.15** Прэм'ера. Фільм «Дах».
**01.05** «Прытулак камедыянтаў».

**07.00** «Анфас».
**07.15** «Афрамасквіч». Камедыйны серыял.
**08.05** Фільм «Гэты нягоднік Сідараў». СССР, 1983 г.
**09.10** «Дабро пажаліцца».
**09.30** «Культурнае жыццё».
**10.00** «Крокі да паспеху».
**10.55** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.05** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.35** Фільм «Семнаццаць імгненняў вясны». СССР, 1973г. 9-я, 10-ая серыі.



**15.50** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.45** Фільм «Дачушка мая». Украіна, 2008 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.25** Фільм «Забіць Біла 2 «.ЗША, 2004г.
**23.55** Фільм «Брат вяэра». Францыя, 2002 г.
**01.55** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.05** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**07.30** Усё аб бяспецы.
**08.00** Тэлепорт.
**08.25** Нашы тэсты.
**09.05** Жансавет.
**09.45** Свая кампанія.
**10.35** «Проста Хлеб». Дакументальны фільм (Беларускае тэлебачанне).
**11.05** «Запал па культуры».
**11.45** Лірычная камедыя «Дзінокае неба» (Расія). 1-4, заключная, серыі.
**14.50** Гістарычная драма «Генерал» (Расія).
**16.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Ліверпуль-Чэлсі. Прамая трансляцыя.
**19.00** «Зоркі гумару». Гумарыстычная праграма (Расія).
**19.40** Камедыя «На мора!» (Расія).




**21.40** Жывы гук.
**22.25** Прыгодніцкі фільм «Самы хуткі «Індыян» (ЗША- Новая Зеландыя).

### РОССИЯ

**07.00** Фільм «Шалёны дзень манцёра».
**07.25** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**08.55** Музычная камедыя «Тытунёвы капітан».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** «Канцэрт Кубанскага казачага хору».
**11.30** Фільм «Безназоўная зорка».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Гарадок».
**14.50** Фільм «Тры паўграцыі».
**17.05** Юбілейны гала-канцэрт ВІА «Самацветы» «Усё жыццё наперадзе».
**19.00** Весткі.
**19.20** «Суботні вечар».
**21.15** Фільм «Пярсцёнак з бірузой». Расія, 2008 г.
**00.25** Камедыя «Карнавал».
**02.55** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**05.50** Вострасюжэтны фільм «Жорсткае каханне».
**07.35** «Казкі Бажэнава».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Агляд».
**09.20** «Іх норавы».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Жаночы погляд».
**14.20** Камедыйная меладрама «Не абывайце да цудаў…».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Суд прысяжных: Галоўная справа».
**18.05** «Вочная стаўка».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.10** «Рускія сенсацыі».
**22.05** «Ты не паверыш!».
**23.05** Трылер «Адрачэнцы».
**01.40** Баявік «Капкан для кілера».

### EUROSPORT

**09.30** Ралі. Ралійная серыя IRC. Лас-Пальмас (Канарскія выспы/Іспанія). Дзень 1.
**10.00** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт (Германія). 1/4 фіналу.
**12.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 1/2 фіналу.
**15.00** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт (Германія). 1/2 фіналу.
**16.45** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 1/2 фіналу.
**19.30** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт (Германія). 1/2 фіналу.
**21.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 1/2 фіналу.
**00.00** Ралі. Ралійная серыя IRC. Лас-Пальмас (Канарскія выспы/Іспанія). Дзень 2.
**00.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб Амстэрдама.
**02.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 1/2 фіналу.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**17.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**18.05** Аблічча таталітарызму: «Падзенне жалезнай заслоны», 2009 г., Германія: 3 серыя, «Венгрыя. Вартаўнік жалезнай заслоны».
**19.00** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.30** «Прыгоды ката Філемона», мультсерыял.
**19.45** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.15** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**20.40** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Суботні сеанс: «Чалавек прэзідэнта», палітычны баявік, 2000 г., ЗША.
**22.40** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 2 МАЯ, НЯДЗЕЛЯ

### 1

**08.05** Мультфільм «Казка аб цары Салтане» (СССР).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** «Арсенал».
**09.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.50** Альманах вандраванняў.
**10.15** Культурныя людзі.
**10.50** У свеце матораў.
**11.25** Nota Bene.
**12.10** Меладрама «Блаславіце жанчыну» (Расія).
**14.15** Дакументальны фільм «Невядомая версія. Блаславіце жанчыну». (Украіна).
**14.45** Прэм'ера. Дакументальны фільм «Храмавае кольца Браслаўскага паазер'я» («Белвідэацэнтр»).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм АТН «Берлін: прадчуванне Вясны».
**16.00** Прэм'ера. Драма «У бок ад вайны» (Расія).
**18.00** Суперлато.
**19.15** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.10** «Футбол. Ліга чэмпіёнаў». Відэачасопіс.
**22.40** Прэм'ера. Камедыйная меладрама «Тэорыя хаосу» (ЗША).

### Н

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**09.55** «Фазэнда».
**10.35** «Разумніцы і разумнікі».
**11.20** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**11.55** Фільм «Вакзал для дваіх».
**13.00** Нашы навіны.
**14.35** «Песні Перамогі».
**15.05** Прэм'ера. Севастопальскія апавяды.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Асяроддзе пасялення.
**17.25** Упершыню ў колеры. Легендарнае кіно «Падкідыш».
**18.00** Нашы навіны.
**18.55** Прэм'ера АНТ: «Давай ажэнімся!».
**20.00** Контуры.
**21.05** Здабытак Рэспублікі.
**23.05** Нашы навіны.
**00.10** «Пражэктарпэрысхілтан».

### ТВ

**06.35** «Афрамасквіч». Камедыйны серыял.
**07.25** Фільм «Прыгажун - мужчына». СССР, 1978г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.45** «Дарагая перадача».
**13.55** Фільм «Семнаццаць імгненняў вясны». СССР, 1973г. 11-я, 12-ая. Заключныя серыі.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Ля параднага пад'езду».
**17.20** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Здраднік». ЗША, 2008г.
**22.55** «Прафесійны бокс».
**23.50** Фільм «Фіцкаральда». Германія (ФРГ) - Пяру, 1982г.
**02.25** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**06.50** Дабравест.
**07.15** Мір вашай хаце.
**07.25** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**07.55** Камедыя «На мора!» (Расія).
**09.50** Школа рамонту.
**10.55** Медычныя таямніцы.
**11.40** Кінаспробы.
**12.00** Бухта капітанаў.
**12.40** «Правы чалавека».
**12.55** Авантурная камедыя «Мільёны» (Вялікабрытанія-ЗША).
**14.50** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання»(Украіна).
**15.55** Гандбол. Кубак Беларусі. Фінал. БГК ім.Мяшкова (Брэст)-Дынама (Мінск). Прамая трансляцыя.
**17.35** Пасоўванне+.
**17.55** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Днепр (Магілёў)-Дынама (Мінск). Прамая трансляцыя.
**20.05** Нашы тэсты.
**20.40** Маналогі аб вайне.
**20.50** Тэлебарометр.
**21.10** Экспедыцыя.
**21.40** Смешная часіна.
**22.15** Рамантычная камедыя «Давайце пацалуемся» (Францыя).
**00.15** Свая музыка. Працяг.

### РОССИЯ

**07.00** Камедыя «Карнавал».
**09.40** Фільм «Пярсцёнак з бірузой». Расія, 2008 г.
**11.00** Весткі.
**11.10** Фільм «Пярсцёнак з бірузой». Расія, 2008 г. Працяг.
**13.20** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.00** Весткі.
**14.15** Фільм «Жанаты халасцяк».
**15.55** Прэм'ера. «Кветкі і песні вясны». Святочны канцэрт.
**18.00** Прэм'ера. «Ізмайлаўскі парк». Вялікі гумарыстычны канцэрт.
**19.00** Весткі.
**19.20** Прэм'ера. «Ізмайлаўскі парк». Вялікі гумарыстычны канцэрт. Працяг.
**20.20** Прэм'ера. «Танцы з Зоркамі». Сезон - 2010.
**23.30** Прэм'ера - 2010. Камедыя «Пікап. Здым без правіл». Расія, 2009 г.
**00.50** Прэм'ера. Юбілейны канцэрт групы «Чайф».
**02.25** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.25** Камедыйная меладрама «Не абвыкайце да цудаў…».
**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.50** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.50** «Асабліва небяспечны!».
**11.25** «Першая кроў».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** Прэм'ера. Праект «У пошуках Францыі».
**14.20** Прыгодніцкая камедыя «Лапухі».
**16.00** Сёння.
**16.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**19.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Брудная праца».
**00.05** «Авіятары».
**00.35** «Футбольная ноч».

### EUROSPORT

**09.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 1/2 фіналу.
**10.30** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Спа-Франкашам (Бельгія). Гонка 1.
**11.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Кваліфікацыя. Маракеш (Марока).
**11.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Warm-Up. Маракеш (Марока).
**12.00** Спартовая гімнастыка. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Камандныя спаборніцтвы. Бірмінгем (Вялікабрытанія). Фінал.
**13.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Дзень 1/2 фіналу.
**14.00** Аўтаспорт. Формула-2. Маракеш (Марока). Гонка 2.
**15.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Маракеш (Марока). Гонка 1.
**16.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Маракеш (Марока). Гонка 2.
**17.00** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Спа-Франкашам (Бельгія). Гонка 2.
**17.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Фінал.
**19.00** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт (Германія). Фінал.
**20.15** Спартовая гімнастыка. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы.Бірмінгем (Вялікабрытанія). Фінал.
**21.45** Матаспартыўны часопіс.
**22.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд (Вялікабрытанія). Фінал.
**01.00** Ралі. Ралійная серыя IRC. Лас-Пальмас (Канарскія выспы/Іспанія). Агляд.
**01.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Маракеш (Марока). Гонка 2.
**02.15** Матаспартыўны часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**17.30** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.25** «Кароль Уга», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**19.30** «Прыгоды ката Філемона», мультсерыял.
**19.40** «Старадаўнія інструменты Беларусі», дак. фільм, 2007 г., Беларусь: ч. 3.
**20.00** (Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**20.30** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма).
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.35** Фільматэка майстроў: «Нявеста пірата», драма, 1969 г., Францыя.
**23.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**Пры афармленні падпіскі будзьце ўважлівымі: 1 мая мяняецца наш рахунак у банку. Нумар рахунку: 3012741108019. Падпісацца можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 фил. МГД ОАО «Белинвестбанк», код 153001764, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ________
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ________

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у аддзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 764

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ________

Кассир Всего ________

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

МОДА

# КАСЕТНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ

Іван БІЧ

**У Еўропе назіраецца дзіўная мода — слухаць музыку на аўдыёкасетах. Здавалася, што аўдыёкасета — атрыбут мінулых часоў. Ніхто не сумаваў, калі касета саступіла сваё месца дыску. Аўдыёкасеты мелі свае перавагі: яны былі танныя, імі можна было лёгка карыстацца і рабіць на іх запісы. Аднак з часам яны псаваліся.**

Не зразумела, чаму зараз касеты зноў уваходзяць у моду. Усё пачалося ў мінулым годзе, калі некалькі вядомых брытанскіх гуртоў выпусцілі свае альбомы ў фармаце аўдыёкасет. Крок аказаўся вельмі паспяховым. Ужо сам па сабе фармат выклікаў цікавасць публікі. Далей больш. Нечакана для сябе ўсе, хто былі маладымі ў 1970–1980-я гады, зноў захацелі слухаць музыку на касетных магнітафонах.

Упершыню аўдыёкасета — кампактны пераносчык інфармацыі на магнітнай стужцы — была прадстаўлена ў 1963 годзе кампаніяй «Philips». Супрацоўнікі кампаніі назвалі свой прадукт Compact Cassette. Касета вельмі хутка склала канкурэнцыю вінілавым пласцінкам. Ужо ў 1964 годзе ў Гановеры (ФРГ) пачалася масавая вытворчасць касет. У 1966-м касеты дабраліся да ЗША і спачатку выкарыстоўваліся збольшага журналістамі для запісу інтэрв'ю. У 1971 годзе фірма «Advent Corporation» распрацавала касету з магнітнай стужкай на аснове аксіду хрому. Якасць гуку была настолькі добрай, што касеты можна было выкарыстоўваць для самастойнага запісу музыкі.

Аднак масавая вытворчасць касет і, адпаведна, бум пачаўся, калі ў 1979 годзе японская кампанія «Sony» вывела на рынак славуты «Walkman» — кампактны магнітафон, які можна было браць з сабою куды заўгодна. «Walkman» значыў рэвалюцыю ў музычным бізнесе. Вельмі хутка маштабы вытворчасці касет сталі большымі за тыражы вінілавых пласцінак.




**Залатой эрай касет лічыцца перыяд з 1985 па 1992 год. У гэты час касетнай рэвалюцыі шмат спрыяла з'яўленне бум-боксаў і плэераў. Яны сталі абавязковым атрыбутам культуры хіп-хопу**



Залатой эрай касет лічыцца перыяд з 1985 па 1992 год. У гэты час касетнай рэвалюцыі шмат спрыяла з'яўленне бум-боксаў і плэераў. Яны сталі абавязковым атрыбутам культуры хіп-хопу. Натуральна, больш за ўсё цаніліся японскія і нямецкія магнітафоны, аднак існаваў і бюджэтны варыянт — кітайскі. Тое ж самае было з касетамі. Лепшымі лічыліся касеты «BASF». Да касет другога гатунку належалі паўднёвакарэйскія.

Прыблізна ў 1992 годзе паступова кампакт-дыскі пачалі цясніць касеты. І нарэшце ў 2003-м вядучыя кампаніі прыпынілі выпуск запісаў на касетах.

Што зноў пачалі знаходзіць людзі ў касетах, акрамя настальгіі па добрых 1980–1990-х? Па словах фанатаў, у запісах на касетах прысутнічае элемент мастацтва. У адрозненні ад CD, касеты дапамагаюць захаваць адчуванне таго, што музыка — гэта нешта унікальнае.

Асабліва гэта тычыцца тых людзей, якія слухалі ў 1980-х гадах панк-музыку. Маленькія панкаўскія студыі не маглі дазволіць сабе запіс дыскаў, таму запісвалі альбомы выключна на касетах. Тыя касеты з запісамі таксама ніхто не прадаваў. Існавала складаная сістэма распаўсюду. Людзі перапісвалі запісы ў сяброў або дасылалі на студыю чыстую касету з просьбай запісаць на яе запіс. Пры гэтым уладальнікі студый ніякіх грошай не атрымлівалі. Так патрабавалі прынцыпы культурнага руху Do it yourself (DIY), да якога яны сябе адносілі. Запісы на студыях DIY часам былі вельмі аматарскія, аднак маштабы руху настолькі вялікія, што праз сістэму DIY шматлікія групы выходзілі на вялікую сцэну, напрыклад брытанскі калектыў «Chumbawamba». Спецыялісты, якія даследуюць цяперашні фенамен папулярнасці касет, адзначаюць, што запісы року 1980-х гадоў якраз найбольш запатрабаваныя зараз на касетным рынку.

Калі мода на касеты дабярэцца да нашых краёў, думаецца, тут у яе будзе шмат адэптаў. Касетная савецкая і постсавецкая культура ў 1980–1990-я гады была вельмі моцнай. Увогуле, да 1979 года савецкіх касет не існавала. Імпартныя можна было набыць на чорным рынку, аднак каштавалі яны вельмі дорага, прыблізна 9 рублёў. Падчас падрыхтоўкі да маскоўскай Алімпіяды ў Палітбюро вырашылі наладзіць выпуск айчынных касет. Адразу згадваюцца касеты фірмы «Свема». Аднак усё роўна перавагу наш народ аддаваў прадукцыі «BASF», «JVC», «TDK», «Sony», «Agfa» і іншых кампаній.

Падчас Перабудовы з-за прыходу на рынак кітайскіх і паўднёвакарэйскіх касет кошт на іх значна ўпаў. Касеты сталі часткай паўсядзённая культуры тынэйджэраў. Адразу ўзнік нефармальны рынак касет. На ім можна было набыць запісы таго ж Высоцкага. Калі ў СССР дазволілі камерцыйную дзейнасць, нефармалы легалізаваліся. У кожным горадзе існавала як мінімум адна кропка запісаў. Гэта быў сапраўдны рытуал, які і не сніўся цяперашнім карыстальнікам кампактаў. На тых кропках — іх ведала ўся прасунутая моладзь — можна было запісаць рэдкія ў СССР рок-гурты. Для гэтага трэба было знайсці назву гурта і альбом у доўгім спісе, які вісеў збоку шапіка. Пасля трэба было аддаць чалавеку ў кіёску грошы і чыстую касету. Гандляр даваў квіток і казаў, калі забраць запіс. Цяпер трэба было пачакаць пару дзён. Чаканне таксама было часткай рытуалу. Праз некалькі дзён чакання нарэшце запісаную касету вярталі. Калі ты жыў у інтэрнаце, гэта была падзея для ўсіх мясцовых меламанаў. Усе збіраліся вакол магнітафона ў чаканні цуду.

Застаецца дадаць, што нават сёння ў час росквіту кампакт-дыскаў касеты дамінуюць на рынку трэцяга свету. І яшчэ касетам мусяць быць вельмі абавязаныя ісламісты. Менавіта дзякуючы касетам запісы аяталы Хамейні сталі папулярнымі ў шахскім Іраку і стварылі яму імідж галоўнага змагара.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Я думаю, што Лукашэнка, паколькі мужык ён недурны, павінен разумець, што з ім можа адбыцца тое ж самае. Акрамя таго, ходзіць шмат чутак пра ўдзел Расіі. Ва ўсякім разе тое, што Расія відавочна была не на баку Бакіева ва ўсёй гэтай завірушцы, — гэта мне здаецца відавочна. Думаю, што ў Бацькі таксама былі падставы чакаць, што ў выпадку чаго Расія прыйдзе яму на дапамогу. Не прыйдзе. Ён столькі разоў ашукваў, «кідаў», называў усякімі рознымі словамі першых асоб РФ, што чакаць падтрымкі ад іх яму не варта. ЕС таксама наўрад ці будзе ратаваць Бацьку. Таму для Бацькі сёння рацыянальна фармаваць групу падтрымкі сярод аўтакратаў. Узбекістан яшчэ ёсць. Туркменістан, натуральна. Ва ўсякім разе, такі аўтакратычны клуб, які, калі што, прыме Лукашэнку. Падумайце, яму наогул няма куды бегчы. У Расію — не. Ва Украіну — не. У ЕС — не. Куды ён уцячэ? Ва Узбекістан і Туркменістан. Усё.

**«Эхо Москвы» (Расія)**

Я не думаю, што рашэнне Лукашэнкі носіць адназначна скандальны характар. Мне здаецца, што яно ўсіх задавальняе. Расію — паколькі Бакіеву дала прытулак не яна. Казахстан, які таксама не ў захапленні ад таго, каб трымаць на сваёй тэрыторыі Бакіева. Кыргызстан — паколькі Бакіеў апынуўся дастаткова далёка ад тэрыторыі рэспублікі, і ўявіць, што ён раптам дзесьці высадзіцца і ўздыме сваіх прыхільнікаў, складана. Я думаю, што рашэнне Лукашэнкі з'яўляецца кансенсусным. Яно не замінае Лукашэнку далей заставацца маргіналам і ў той жа час захоўвае твар прэзідэнтам СНД у адносінах да калегаў па постсавецкай прасторы.

**Русская служба «Радио Свобода» (Расія)**

Адкуль такая нервовасць, дзеля чаго трэсці атмасферу, зацягнутую вулканічным попелам? Разгадка простая: Аляксандр Лукашэнка, нібы добры акцёр МХАТу, ужыўся ў кіргізскую сітуацыю на поўную. Тут вам і прапанаваныя акалічнасці, і звышзадача: на ўсёй постсавецкай прасторы ён застаўся самым слабым звяном. Усе апошнія выступы Лукашэнкі нікога не чапаюць. Калі Беларусь можа лёгка «знайсці шчасце» на іншых рынках — паспехаў. Калі ўжо ідуць танкеры з нафтай з Венесуэлы — рыхтуйце порт да прыёму дарагіх госцяў. І гэтак далей. Выснова з усяго сказанага толькі адна. Перад Лукашэнкам стаіць выбар: або ён пагаджаецца з палітыкай Масквы, карыстаецца датацыямі і выконвае свае шматлікія абяцанкі, або ідзе ў «аўтаномку» на пошукі шчасця ў іншых берагоў. З цалкам прадказальным вынікам. Разам з Бакіевым. І без усякай надзеі пасяліцца са сваім сямействам у падмаскоўным катэджным гарадку.

**«Сегодня» (Расія)**

Галоўнае ў тым, што Расія і ЗША стварылі ўжо другі прэцэдэнт сумесных дзеянняў на постсавецкай прасторы, ці, прынамсі, сталі ўзгадняць свае пазіцыі па тым, як і хто на іх рэагуе. У любым выпадку, пакуль публічных рознагалоссяў у пазіцыях лідэраў Расіі і ЗША з нагоды кіргізскіх падзей няма. У гэтай сувязі афіцыйнаму Мінску трэба тысячу разоў падумаць, як і з чым ехаць у Маскву.

**«Регнум» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### РАСІЯ. НОВЫЯ ПРАЖЭКТЫ ГАЛОЎНАГА КАЛМЫКА

17-ю гадавіну свайго знаходжання на пасадзе прэзідэнта Калмыкіі адсвяткаваў Кірсан Ілюмжынаў. Святкаванне прайшло не вельмі радасна. Апазіцыя заявіла, што прэзідэнт давёў край да эканамічнай катастрофы. Калмыкія зараз другі пасля Інгушэціі суб'ект Расійскай Федэрацыі па колькасці датацый. А ў цэнтры Элісты адбыўся пікет, арганізаваны камуністамі і журналістамі, якія незадаволеныя палітычным курсам Ілюмжынава, у прыватнасці пераследам прэсы. Між тым, сам прэзідэнт працягвае прапаноўваць глабальныя праект. Раней Кірсан марыў ператварыць Элісту ў сусветную нефармальную сталіцу шахмат. Зараз лідэр калмыкаў марыць трансфармаваць родны край у «мясны пояс» Расіі і пабудаваць канал, які злучыць Каспійскае мора з Азоўскім. Працўнікі прэзідэнта лічаць, што яго новыя ідэі — толькі дэкларацыі, якімі ён корміць народ. Між тым, Масква ўжо афіцыйна падтрымала праекты Ілюмжынава, праўда, грошай пакуль не дала.

**Па матэрыялах «Фергана» (Узбекістан)**

### ВЕНЕСУЭЛА. ДЗЕНЬ МІЛІЦЫІ

Уга Чавес падпісаў загад, адпаведна якому з гэтага года 13 красавіка будзе святкавацца як дзень балівáрскай міліцыі. Атрады балівáрскай міліцыі ствараюцца на базе лаяльных дзяржаве арганізацый. Венесуэльскі прэзідэнт разглядае іх як важны інстытут у агульнай сістэме бяспекі свайго рэжыму. Пра ўсталяванне Дня міліцыі было абвешчана падчас афіцыйнага мітынгу. Выступаючы перад натоўпам у 35 тысяч чалавек, Чавес не толькі сказаў пра новую чырвоную дату ў календары, аднак таксама заклікаў міліцыянераў да баявой гатоўнасці. Па яго словах, падчас кампаніі па выбарах у парламент увосень гэтага года яго зноў будуць намагацца гвалтоўным метадам пазбавіць пасады.

**Па матэрыялах «El Pais» (Іспанія)**

### ЗІМБАБВЕ. 30 ГАДОЎ ДЫКТАТУРЫ МУГАБЭ



Народ Зімбабве адзначае дату, якую не зразумела, якім чынам адзначаць, — як трагедыю, або як свята. 30 гадоў таму краіна стала незалежнай, аднак у той жа дзень да ўлады прыйшоў Роберт Мугабэ, які з тых самых часоў не пакідае пасаду прэзідэнта. Мугабэ даўно ўжо перайшоў усе межы разумнага. Міжнародныя праваабарончыя арганізацыі абвінавачваюць яго ў забойстве як мінімум 20 тысяч чалавек. У 2000 годзе дыктатар даў дазвол нападаць на гаспадаркі белых фермераў і канфіскоўваць іх. Нацыяналізацыя прывяла да неўраджаю і голаду. Мугабэ даўно забаронены ўезд у Еўрапейскі саюз. Супраць краіны дзейнічае шмат эканамічных санкцый. Дыктатар кажа, што менавіта з-за іх у краіне пэрманентны эканамічны крызіс.

**Па матэрыялах «Mail and Guardian» (ПАР)**

### ГРУЗІЯ. АДЖАРЫЯ ПАТРАБУЕ БОЛЬШ АЎТАНОМІІ

Старшыня ўрада аўтаномнай рэспублікі Аджарыя Леван Варшаламідзе нечакана раскрытыкаваў урад краіны, запатрабаваўшы адміністрацыйных паўнамоцтваў для Аджарыі. Пасля «рэвалюцыі руж» гэта першы выпадак, калі з Батумі на адрас Тбілісі прагучала крытыка. Старшыня ўрада Аджарыі папракнуў цэнтральны ўрад Грузіі ў тым, што апошні цалкам ігнаруе правы аўтаноміі. Як заявіў Варшаламідзе, міністэрствы Аджарыі не могуць самастойна прымаць простыя тэхнічныя рашэнні і чакаюць подпісу якога-небудзь тбіліскага бюракрата. Для рашэння гэтай праблемы з 2009 года ён дасылае прэм'ер-міністру лісты, аднак яны застаюцца без адказу. Хутка выбары, і Варшаламідзе імкнецца даказаць аджарцам, што ён абараняе інтарэсы мясцовага бізнесу і насельніцтва.

**Па матэрыялах грузінскай прэсы**

### КАНАДА. ІНДЗЕЙСКІ РАСІЗМ У ДЗЕЯННІ

З рэзервацыі Канаваке, дзе пражываюць індзейцы племені махавакі, выкінулі 26 белых, якія праігнаравалі закон аб высяленні. Яшчэ ў лютым праваднікі махавакаў пастанавілі, каб усе людзі з белай скурай, якія жывуць у рэзервацыі, пакінулі яе. Усяго ў рэзервацыі пражывае 8 тысяч чалавек. З іх толькі 300 белыя. У прынцыпе, палітыка апартэіду мела месца і раней. У 1973 годзе махавакі выгналі з рэзервацыі тысячу белых. З нядаўняга часу цыгараты ў мясцовых табачных крамах мелі права набываць выключна індзейцы. Самі праваднікі махавакаў вельмі проста тлумачаць сваю палітыку: «Мы асобны народ з асобнай гісторыяй і культурай. Мы — не канадцы. Мы — махавакі. Мы мусім абараняць нашу культуру». Аднак белыя, якія жывуць у рэзервацыі, кажуць, што новы закон — папросту спроба выбіць грошы. Выганяюць з Канаваке выключна тых, хто не хоча пакласці на лапу ў адміністрацыю рэзервацыі.

**Па матэрыялах канадскай прэсы**

ВЫБАРЫ

# БРЫТАНСКІ АБАМА

Алег НОВІКАЎ

**Праз 80 гадоў перапынку брытанскія лібералы блізкія да таго, каб зноў увайсці ва ўрад. У такім выпадку, па ацэнках экспертаў, палітычную сістэму Вялікабрытаніі чакаюць вялікія трансфармацыі.**



15 красавіка ў Англіі адбылося нешта падобнае на тое, што мела месца ў студзені 2008 года ў ЗША ў штаце Айова. Тады на папярэдніх выбарах кандыдата ад Дэмакратычнай партыі нечакана для ўсіх перамог на той час яшчэ малавядомы на нацыянальным узроўні сенатар Барак Абама. Тая перамога зрабіла яго пазнавальнай асобай у кожнай амерыканскай сям'і і адкрыла шлях у Белы дом.

Так і малавядомы старшыня партыі ліберал-дэмакратаў Нік Клег пасля тэлевізійных дэбатаў з лейбарыстам Горданам Браўнам і кансерватарам Дэвідам Камеруннам стаў ледзь не нацыянальным героем. Клег, як і Абама, быў больш падобны на чалавека, ад якога можна чакаць пераменаў. І гэта пры тым, што яшчэ за дзень да дэбатаў ніхто ўсур'ёз не ставіўся да яго як да суперніка.

Думаецца, з усёй біяграфіі Ніка Клега самы цікавы момант — ягоныя карані. Па бацькоўскай лініі ён паходзіць з арыстакратычнага роду Закрэўскіх. У астатнім — тыповая біяграфія выхадца з багатай сям'і банкіра. Нарадзіўся ў 1967 годзе. Школа ў Вестмінстары, вучоба ў Кембрыджы, практыка ў ЗША, праца журналіста, праца ў апараце ЕС (дарэчы, адказваў за Усходнюю Еўропу), перамога на выбарах у парламент, кар'ера ў шэрагах партыі. Жанаты: мае трох дзяцей. Самы буйны скандал — інтэрв'ю жаночаму часопісу «GQ», у якім заявіў, што быў у блізкіх адносінах не больш чым з 30 жанчынамі. Заява выклікала шэраг іранічных заўваг з боку феміністак.

Не вельмі вялікай была і цікавасць да партыі Клега. З авансцэны брытанскай палітыкі лібералаў папрасілі лейбарысты ў 1920-я гады. Вынік, які шмат каму ў тыя часы здаваўся дзіўным, асабліва з улікам таго, што лаўры архітэктара перамогі ў першай сусветнай вайне атрымаў ліберальны прэм'ер Дэвід Ллойд Джордж.

Апошні раз лібералаў бачылі ў Уайт Холе (лонданскі ўрадавы квартал) у 1931 годзе, калі быў сфармаваны г. зв. «нацыянальны ўрад», галоўнай задачай якога было пераадоленне сусветнага крызісу. У часы другой сусветнай вайны Чэрчыль зноў сфармаваў нацыянальны ўрад. Аднак на гэты раз лібералам не давярылі ніводнага міністэрскага партфеля: яны кантралявалі толькі ведамства грамадзянскай авіяцыі.

Пасля 1945 года партыя ўвогуле заставалася ў парламенце толькі дзякуючы лакальнай палітычнай традыцыі некаторых рэгіёнаў, кшталту Ліверпуля, гарадоў Шатландыі і Уэльса, дзе дзесяцігоддзямі людзі традыцыйна галасавалі за лібералаў.

Свае пазіцыі лібералы пачалі паступова вяртаць у 1970-я гады за кошт праеўрапейскіх лозунгаў, стварыўшы імідж самай праеўрапейскай палітычнай сілы ў Вялікабрытаніі. У 1980-я, пасля аб'яднання з сацыял-дэмакратамі, партыя стала афіцыйна называецца «ліберал-дэмакратычнай». З тых часоў некалькі разоў мелі месца кансультацыі пра ўваходжанне яе прадстаўнікоў у склад ураду лейбарыстаў. Аднак усе перамовы заканчваліся крахам пасля таго, як лібералам адмаўлялі ў іх галоўным патрабаванні — увесці ў краіне прапарцыянальную выбарчую сістэму.

Такі крок сапраўды мог значыць вялікія перамены. Рэйтынг падтрымкі лібералаў з пачатку 1990-х стабільна складае каля 20 працэнтаў. Аднак з-за таго, што сістэма ў Вялікабрытаніі мажарытарная, у парламенце яны прадстаўленыя вельмі сціпла. Зараз іх толькі 60 чалавек, і на вялікую палітыку яны мала ўплываюць.

І вось час лібералаў надышоў. Па апытаннях, яны карыстаюцца падтрымкай 31 працэнта брытанскага электарату. Напярэдадні дэбатаў у іх было 23 працэнты. Такім чынам, лібералы абышлі па рэйтынгу лейбарыстаў (28 працэнтаў) і нават кансерватараў (30 працэнтаў).

Натуральна, з-за мажарытарнай выбарчай сістэмы іх прадстаўніцтва ў Палаце абшчынаў будзе значна меншым. Аднак у любым выпадку квоты лібералаў будзе дастаткова, каб вядучыя партыі не атрымалі абсалютнай большасці і, адпаведна, не маглі сфармаваць урад без удзелу ліберал-дэмакратаў.

Галоўнымі ахвярамі Клега з'яўляюцца кансерватары. Яны не толькі прайгралі дэбаты на тэлебачанні. Яны цалкам згубілі былую перавагу: год таму прыкладна 40 працэнтаў брытанцаў збіраліся галасаваць за торы. Тым не менш пакуль ніякіх сігналаў наконт магчымай кааліцыі з лібераламі з іх боку не паступала.

Іншая сітуацыя ў лагеры лейбарыстаў. Гордан Браўн, здаецца, ужо прымірыўся з думкай наконт магчымага саюзу Клегам. 20 красавіка ў інтэрв'ю «Independent» цяперашні прэм'ер фактычна заклікаў да стварэння Lab-Lib (так назвалі магчымую кааліцыю ў СМІ).

Пакуль што Нік і яго калегі рашуча адмаўляюць ідэю саюзу з лейбарыстамі. Аднак назіральнікі схіляюцца да таго, што аб'яднанне цалкам магчымае. Наступствы прыходу лібералаў могуць быць самыя непрадказальныя. Лібералы, нагадаем, выступаюць за вывад войскаў з Ірака, увядзенне еўра і, нарэшце, за выбары па партыйных спісах. Рэалізацыя на практыцы любой з гэтых прапаноў значыла б рэформу базавых інстытутаў брытанскай палітыкі.

Пакуль аналітыкі займаюцца спекуляцыямі, Вялікабрытанія перажывае сапраўдную клегаманію. У модзе значкі і майкі з яго выявай, у тым ліку тыя, на якіх ён стылізаваны пад Чэ Гевару. Адпаведна адному з апытанняў, брытанцы лічаць Клега самым папулярным палітыкам з часоў Чэрчыля. Але да выбараў яшчэ амаль два тыдні.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ТАБАЧНАЯ АДУКАЦЫЯ

Алег НОВІКАЎ

**Дзмітры Табачнік, скандальны ўкраінскі міністр адукацыі і навукі, абвясціў пра пачатак у краіне рэформы сістэмы адукацыі.**



Гуманітарная палітыка — самая простая і адначасова самая складаная галіна дзяржаўнай палітыкі ва Украіне.

Правесці рэформы ў навуцы, адукацыі ці мове значна прасцей, чым узняць пенсіі або адрадзіць прамысловы сектар. Дастаткова толькі падпісаць адпаведны цыркуляр.

З іншага боку, культурна-гістарычны падзел Украіны на Захад і Усход патрабуе ад чыноўніка, адказнага за гэты накірунак, вялікай далікатнасці. Адна неасцярожная трактоўка таго ці іншага гістарычнага персанажа, непрадуманая рэпліка наконт моўнага пытання — і адразу на цябе паставяць кляймо «маскаля» або «бандэраўца».

Амаль усе палітычныя каментатары ва Украіне прызнаюць, што далікатнасць і асцярожнасць даўно ўжо не характэрныя для тых, хто адказвае за гуманітарныя ведамствы.

Эпоха «аранжавых» стала часам фарсіраванай украінізацыі і навязвання грамадству гістарычных дактрын, якія былі неадназначна ўспрынятыя на Усходзе. Аднак новая бела-блакітная ўлада, здаецца, не зрабіла ўрокаў з досведу сваіх папярэднікаў, наступаючы на тыя ж самыя граблі.

Дзмітры Табачнік — сёння, безумоўна, самы вядомы міністр ва ўрадзе. Славу яму зрабілі студэнты Львова, якія пасля прызначэння Табачніка на пасаду міністра згадалі ягоную сентэнцыю пра тое, што жыхары Галіцыі — асобная ад украінцаў нацыя. У сакавіку па шматлікіх універсітэтах прайшлі акцыі за адстаўку Табачніка. Тры абласныя саветы Заходняй Украіны прынялі зварот да Януковіча з патрабаваннем адстаўкі. У самой Вярхоўнай радзе фракцыі «аранжавых» беспаспяхова спрабавалі зняць міністра шляхам галасавання.

Аднак вынік антытабачнай кампаніі быў адваротным.

«Украінская Праўда» прызнавала: «Лютая кампанія супраць «украінафоба Табачніка» зрабіла Табачніка своеасаблівым сцягам Паўднёвага Усходу. Жыхары Данбаса і Крыму маглі б знайсці героя больш сімпатычнага, але спрацаваў стары добры прынцып «на зло ворагу». Чым гучней нацыянал-патрыятычныя абвінавачванні ў адрас Табачніка, тым хутчэй расце папулярнасць скандальнага міністра на процілеглым ідэалагічным полюсе».

На гэтай хвалі растучай папулярнасці Табачнік задумаў рэформу адукацыі ва Украіне.

Вось яе галоўныя накірункі:

- пераход усіх ведамасных ВНУ пад кантроль Мінадукацыі;
- узбуйненне вядучых ВНУ за кошт ліквідацыі малых;
- новыя правілы прыёмы ў ВНУ: акрамя вынікаў тэстаў на ўступленне будзе ўплываць бал школьнага атэстата;
- усе школьнікі Украіны пачнуць здаваць тэсты на мове навучання ў школах. Тэсты для гэтага будуць перакладзены на мовы нацменшасцяў (крымска-татарскую, малдаўскую, польскую, венгерскую, рускую і румынскую).
- бацькі ўкраінскіх школьнікаў і студэнты атрымаюць права выбіраць мову навучання.

Змены моўнай палітыкі пацягнуць за сабою змену статусу ВНУ. Навучальныя ўстановы атрымаюць больш аўтаноміі, каб больш гнутка вызначаць мову навучання.

У прынцыпе, патрэба структурных рэформаў у галіне адукацыі сапраўды відавочная. Інакш бы рэктары большасці ўкраінскіх ВНУ на спецыяльным пасяджэнні не падтрымалі ініцыятывы Табачніка (тут, дарэчы, няма нічога дзіўнага: лепшыя і прэстыжныя універсітэты традыцыйна сканцэнтраваныя на прамыслова развітым рускамоўным Усходзе).

Тым больш ініцыятывы Табачніка былі агучаныя ў час, калі ў асяроддзі прафесуры ўсё часцей гучаць галасы супраць пераходу ўкраінскіх ВНУ на прынцыпы еўрапейскай, г. зв. Балонскай, адукацыйнай сістэмы.

Асабліва незадаволеныя тэхнічныя ВНУ. «Выклікае сумнеў распараджэнне пра падрыхтоўку бакалаўраў і магістраў на працягу трох-чатырох гадоў. Якія пасады можа займаць выпускнік пасля трохгадовай тэарэтычнай падрыхтоўкі? А нашто патрэбная траекторыя вольнага выбару? Гэта можа стаць дадатковай паслугай, але не абавязковым выбарам кожнага студэнта. Якія прадметы могуць абраць студэнты-першакурснікі?» — адзначае рэктар Адэскага політэхнічнага універсітэта.

Праблема, аднак, у тым, што хутка ў рэформе Табачніка на першае месца выйшаў прынцып гуманітарнага рэваншу. Як заявіў міністр, бліжэйшым часам будуць таксама перапісаныя падручнікі гісторыі.

На думку Табачніка, у аснову выкладання гісторыі мае быць пакладзены прынцып антрапацэнтрызму. Апошні павінен замяніць этнацэнтрызм, што, як лічыць чыноўнік, дамінуе ў цяперашніх падручніках. «Мы павінныя адмовіцца ад этнацэнтрызму. Інакш кажучы, ад этнічнага падыходу і гіпербалізацыі дзяржавы, вайсковых аспектаў выкладання. То бок у цэнтры — чалавек, а не дзяржава».

Ініцыятыва Табачніка, хаця і пад гуманітарным соусам, выклікала пратэсты з боку нават не ўкраінскамоўнай грамадскасці. Відавочна, што напісаць тэкст гісторыі Украіны на прынцыпах антрапацэнтрызму не проста. Вайна з Гітлераўскай Германія аб'ектыўна таксама несла пакуты простаму чалавеку. Значна прасцей рэанімаваць або імпартаваць з Расіі старыя гістарычныя дактрыны пра славянскае брацтва і Кіеўскую Русь — калыску рускай дзяржаўнасці.

Тым больш, што менавіта такую трактоўку гісторыі замаўляе выбаршчык на Усходзе, заклапочаны тым, як дасадзіць «аранжавым фашыстам». У гэтым накірунку ўсё зараз і ідзе. Табачнік ужо абвясціў пра вяртанне ў новыя падручнікі савецкага гістарычнага тэрміну «Вялікая Айчынная вайна».

Пытанне застаецца адкрытым: як далёка можа зайсці Табачнік і «Партыя рэгіёнаў» у сваіх намерах за кошт гуманітарнай сферы кампенсаваць адсутнасць эканамічнага росту і захаваць адначасова электаральную падтрымку на Усходзе?

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ЮЛІУС МАЛЕМА



Кіраўнік радыкальнай моладзевай фракцыі кіручай у Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы (ПАР) партыі Афрыканскі нацыянальны кангрэс (ANC), здаецца, вырашыў калі не сарваць, то яўна паставіць пад пагрозу правядзенне ў ПАР Чэмпіянату свету па футболу. Нагадаем, што з-за палітычнай напружанасці, выкліканай забойствам лідэра мясцовых белых расістаў Юджына Тэрбланша, з'явіліся чуткі пра тое, што права правядзення турніру ў Прэторыі адбяруць. Пасля пахавання Тэрбланша палітычныя эмоцыі быццам трошкі астудзіліся. Пакуль слова не далі Малеме. Выступаючы на адным з мітынгаў, Юліус сказаў усё, што думае пра белых грамадзян ПАР. Па яго словах, права чорнага насельніцтва галасаваць нічога не значыць без права валодання зямлёй (большасць зямлі ў ПАР належыць белым фермерам). Малема таксама паабяцаў, што ў выпадку выгнання белых фермераў на дапамогу чорным сялянам прыйдзе кітайскі інвестар. Між тым, кіраўніцтва ANC не ў захапленні ад правакацый Юліуса, якія могуць прывесці да расавых пагромаў. Ёсць інфармацыя, што партыйная дысцыплінарная камісія збіраецца вынесці Малеме як мінімум папярэджанне.

### ДЖАНФРАНКА ФІНІ



У спікера італьянскага парламенту з часоў уваходжання яго партыі «Нацыянальны альянс» у склад партыі «Народ Свабоды» (PDL), якую ўзначальвае Берлусконі, моцна сапсаваліся адносіны з прэм'ерам. Фіні не падабаецца палітычны стыль Берлусконі, яго нежаданне каардынаваць свой курс з партыяй і, нарэшце, ён яўна раўнуе боса да лідэра «Лігі Поўначы» (партыя — саюзнік PDL, якая выступае за пашырэнне аўтаноміі правінцый на Поўначы Італіі). І вось палітык рашыўся на адкрыты дэмарш. Ён заявіў, што створыць у парламенце сваю ўласную дэпутацкую групу — PDL-Italia. Гэта, натуральна, не выклікае захаплення ў кіраўніцтва партыі. Берлусконі заявіў, што Фіні парушае партыйны статут і можа ісці куды заўгодна, калі захоча. Аднак прэм'ер прызнаў, што пры такім сцэнары партыі пагражае раскол. На сённяшні дзень да групы Фіні ўжо далучыліся каля 40 парламентарыяў.

### РУСТАМ МІНІХАНАЎ



Прэзідэнт Татарстана Мініханаў апынуўся ў дзіўнай сітуацыі. Кіраўнікі мусульманскіх абшчын і татарскіх нацыянальна-культурных аўтаномій Арэнбурга звярнуліся да прэзідэнта Татарстана і да старшыні рэспубліканскага парламента з просьбай дапоўніць назву Рэспублікі Татарстан словам «Булгарыя» па ўзоры рэспублік Саха (Якутыя) і Асецця-Аланія. «З падручнікаў гісторыі і органаў масавай інфармацыі складаецца ўражанне, што татары — гэта заваёўнікі-манголы, — гаворыцца ў звароце. — Мы, аднак, не тыя татары, якія знішчылі незалежную дзяржаву Волжская Булгарыя, а потым заваявалі рускія княствы. Мы з'яўляемся нашчадкамі волжскіх булгараў, гэта прызнае пераважная большасць навукоўцаў, гэта пацвярджае і аддзяленне гісторыі РАН». Зварот падпісалі старшыня Духоўнага кіравання мусульман Арэнбургскай вобласці і старшыня культурнай аўтаноміі татараў Арэнбургу. Пакуль татарскі лідэр ніяк не адказаў на дзіўны ліст. Між тым, стала вядома, што ўлады Татарстана плануюць дамагацца ад ЮНЕСКА ўключэння музея-запаведніка горада Булгар, які быў у старажытнасці сталіцай татарскай дзяржавы, у спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны.

З'ЯВА

# СЕМ ЦНОТАЎ БГ

## З НАГОДЫ МІНСКАГА КАНЦЭРТА «ДЗЕНЬ РАДАСЦІ» 17 КРАСАВІКА — І ПРОСТА ТАК

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**Музыку гурта «Акварыум» і асабіста яго лідэра Барыса Грабеншчыкова чамусьці вельмі любяць слухаць літоўцы. Не ў Літве, а літоўцы. Проста бяруць кружэлку, ставяць у магнітолу і слухаюць. А потым напяваюць з лёгкім балцкім акцэнтам, які чараваў яшчэ Іосіфа Бродскага. Асабліва гэта заўважна ў першыя месяцы пасля выхаду новага альбому культавага музыкі.**

Прыбалтыйскі феномен «Акварыума» адзначалі даўно і многія, але, па маіх назіраннях, трымаецца ён менавіта на бязмежным шанаванні БГ адукаванай часткай літоўскага насельніцтва. Нават выступае ён у Вільні часцей, чым дзе б там ні было, і з асаблівым значэннем. Вось у мінулым годзе сыграў два акустычныя канцэрты ажно ў храме — Касцёле святой Катрыны, які цяпер служыць канцэртнай залай.

Літву ў культурным плане я заўжды ўспрымала, як суседскую дзяўчыну, якая ніколі не ганіцца за модай, але заўжды застаецца эталонам выключнага стылю і добрага густу. І таму, упершыню сутыкнуўшыся з літоўскай БГ-маніяй, я палічыла гэта знакам таго, што калі ў 12 год між іншых вінілавых скарбаў бацькоў я адкапала кружэлку «Радио «Африка», гэта было першым крокам у правільным асабіста для мяне напрамку.

### Малітва і пост

Канцэртны зал «Мінск», дзе адбываўся нядаўні канцэрт «Акварыуму», мае з рэлігіяй хіба тую сувязь, што месціцца наўпобліз былога паганскага капішча над Свіслаччу. Тым не менш, па настроях публікі, што сабралася, канцэрт гэты нагадваў нейкую экуменічную імшу. На сцяне — выява Сарасваці, індуісцкай багіні, жонкі Брахмы, якая вельмі імпануе рокерам, памяшаным на Усходзе, тым, што ў дзвюх з чатырох сваіх рук трымае музычны інструмент. Звычайныя зоркі публіку перад сваім выхадам разаграваюць. БГ не такі. БГ абкурвае — араматычнымі зёлкамі. Іх водар дабівае са сцэны ў самыя аддаленыя куткі задушнай залы.

Імша пачынаецца аднačасова з першымі акордамі. Вернікі спяваюць хорам. Пасля кожнай песні праз аховы прарываецца група прыхільнікаў і кладзе, не! — ускладае кветкі да ног куміра. Самае частае іх словы пасля «Брава!» — «Дзякуй!». БГ — ці не адзіная жывая легенда расійскага року, якая спраўна канцэртуе. Штовясны «Акварыум» выпраўляецца аб'язджаць свае заходнія парафіі: Прыбалтыку, Беларусь, Украіну — рэгулярная матэрыялізацыя калектыву Мінску таксама надае мерапрыемству характар свяшчэннага рытуалу.

Паўзы паміж спевамі паства запаўняе, выкрыкваючы назвы любімых твораў, — а раптам зайграюць? Істэрычны енк: «Город золотой!!!» — паства прымае хваляй рогату, як удалы жарт або недарэчны ўчынак неафіта. У БГ на сёння больш за 500 песняў, і для яе амаль кожная — хіт. Да таго ж, сталыя адэпты ў курсе: БГ ніколі не імправізуе, кожны нумар выконваецца, таму што так задумана ад пачатку. Штогадовыя канцэртныя туры «Акварыуму» тэматычныя, як нядзельныя казані таленавітага і дасведчанага святара. Праграма «Дзень радасці» — так бы мовіць, філасофская лірыка майстра.

Гурту «Акварыум» сёлета — 37, хоць з самага першага складу нязменным застаўся адно ён, БГ. Паміж часам, калі ў 1980 годзе адна ўлада выгнала яго з працы і выключыла з камсамолу, а ў 2003 годзе іншая ўлада ўручыла яму ордэн «За заслугі перад Айчынай», змянілася адно, а то і два-тры пакаленні, якія перажылі адно, а то і два-тры сацыяльна-гістарычныя ўзрушэнні. І прадстаўнікі кожнага з гэтых пакаленняў былі 17 красавіка ў канцэртнай зале «Мінск». Бо падчас усіх гэтых узрушэнняў іх БГ быў з імі.

### Вялікі дворнік

Пішучы, чаму, на мой погляд, усе гэтыя людзі рознага веку штогод, як на імшу, прыходзяць яго слухаць, я баюся нават не тых, хто лічыць, што БГ — «спявак ні пра што», які ўзяў на сябе функцыі настаўніка жыцця і прарока ў сваёй і шэрагу сумежных айчынаў. Найбольш я баюся тых, хто лічыць, што «БГ — бог, от него сияние исходит». Яны спужалі мяне год пяць таму, калі я натхнілася перакласці на беларускую мову некалькі тэкстаў сучаснага рускага паэта Барыса Грабеншчыкова.

Думаючы, што працую з проста добрай паэзіяй, я апублікавала пераклады ў інтэрнэце... Крытыка і яе аргументы маглі б быць больш прыдзірлівымі хіба ў выпадку, калі б я замахнулася на Псалмы Давідавы ці Песню Песням Саламона. Толькі лянівы не паставіў мне на від неасцярожнае абыходжанне з Сэнсам сказанага дзеля захавання рыфмы ці метафары. Прычым хто дэманстраваў гэтае глыбіннае веданне тэкстаў на рускай мове, апяваючых пераважна рускую культуру, рускую веру і рускую дзяржаўнасць? Цвет беларушчыны, надзея нацыянальнай культуры! Просты пералік імёнаў прымусіў бы ідэолагаў беларускага кансерватыўнага хрысціянства біць у званы ўтрая інтэнсіўней, чым яны гэта робяць на дадзены момант. Уплыў на беларускія інтэлектуальныя эліты блізкі да каласальнага. І тым рызыкоўней інтэрпрэтаваць яго творчасць у асяродку, дзе ў кожнага — свой БГ.

Але я ўсё-ткі паспрабую. Для мяне ў асобе і творчасці БГ палягае сем асноўных цнотаў.

***Першая цнота БГ у яго плённасці і выключным таленце паэта ды кампазітара***

Калі творца перастае тварыць, фанаты яму збольшага прабачаюць. Але тады ўсё яго наступнае існаванне робіцца культам сябе самога ў маладосці ды паразітаваннем на былой славе. Перажыўшы смерць рок-н-ролу, БГ і ў 2000-х працягвае пісаць вершы высокага ўзроўню і аранжаваць цудоўныя песні. Трымае планку. Пры гэтым ён не выходзіць за межы сваёй фірмовай паэтыкі і ніколі не адмаўляецца ад словаў, што спяваў калісьці. У сваіх выступах ён традыцыйна спалучае старое і новае, што дазваляе залагодзіць максімальны спектр прыхільнікаў. Чароўны эфект: пасля канцэрту табе здаецца, што гурт выканаў усе твае самыя любімыя песні, хоць пра многія з іх і згадкі не было. БГ не найлепшы музыка ды спявак — ён адкрыта прызнае гэты факт, і ветліва дзякуе музыкам гурта «Акварыум», якія ператвараюць кожную кампазіцыю ў бязмежна прыгожыя, глыбокія мелодыі ў абсалютна розных стылях — ад этнічных кельцкіх танцаў і рэгі да настальгічнага вальса ці рамансіка ў стылі рускай правінцыі XIX стагоддзя. А без яго ціхага, але выразнага голасу ўявіць яго песні — звычка гадоў — ужо немагчыма. Першая цнота БГ надзяляе нас якасным музычным прадуктам.

***Другая цнота БГ у здольнасці адчуваць пульс эпохі і нават на паўкорпусы апярэджваць яе***

Вось праспяваў БГ у 1991 годзе: «Бог есть свет, и нет в нём никакой тьмы» (альбом «Письма капитана Воронина»). Якія мудрыя і простыя словы! — здзівіліся агаломшаныя аматары савецкага рок-н-рола. Праз некаторы час у межах масавага вяртання ва ўлонне царквы яны разгарнулі Біблію — і зноў здзівіліся: ды гэта ж прамая цытата з Дабравесця святога Яна, ды яшчэ з рускага





### Сем фактаў пра БГ

1. Барыс Барысавіч Грабеншчыкоў (БГ) нарадзіўся ў 1953 годзе ў Ленінградзе. Скончыў факультэт прыкладной матэматыкі ЛДІ. У 1972 годзе заснаваў «Акварыум» — «постмадэрністычны паэтычна-музычны праект». З таго часу — адзін з лідэраў савецкай, а пасля расійскай нефармальнай культуры. Аўтар каля 50 песенных альбомаў і іншых музычных праектаў, выдаў 8 кніг творчасці. Жыве ў Санкт-Пецярбургу.
2. Уладальнікі ленінградскага тэлефоннага нумара 212-85-06, які стаў рэфрэнам знакамітай песні «Акварыума», былі змушаныя адключыць яго праз паўгода пасля выхаду альбому «Дети декабря» — не маглі адбіцца ад шквалу тэлефанаванняў. БГ, якому лічбы спатрэбіліся дзеля рытму, дагэтуль працягвае публічна прабачацца перад гэтымі людзьмі, якіх ён «падставіў, не падумаўшы».
3. З сучасных рускіх пісьменнікаў БГ найбольш любіць Барыса Акуніна і Віктара Пялевіна. Што, зрэшты, заўважна.
4. Адзін юрыст з Цюмені патрабуе адабраць у БГ ордэн «За заслугі перад Айчынай», бо налічыў у яго песнях каля тысячы «заклікаў да змены канстытуцыйнага ладу РФ, ужывання псіхатропных, наркатычных рэчываў, прапаганду алкаголю, садаміі, лайдацтва, суіцыду, анархіі».
5. «Акварыум» застаецца падкрэслена некамерцыйным праектам, музыкі дэкларуюць, што іх мэта — служэнне музыцы. Яны не выступаюць на карпаратывах, не ўдзельнічаюць у сумнеўных шоу і тэлепраектах, прадаюць альбомы «ўдвая танней, чым яны каштуюць», і асноўнай крыніцай заробку называюць гастрольныя туры. Трымаюць сувязь з імпрэсарыё і фанатамі праз сайт www.aquarium.ru. Іх апошнія альбомы можна скачаць на сайце www.kroogi.com.
6. З 2005 года БГ вядзе на «Радыё Расія» цыкл перадач «Аэрастат». Раз на тыдзень цягам гадзіны ён агучвае радыёэсэ пра сваю любімую музыку, ілюструючы жывымі прыкладамі. Архіў перадач можна адшукаць у інтэрнэце.
7. На канцэрце ў Мінску 17 красавіка БГ акапэла заспяваў песню «Пані Ірэна» Аляксандра Вярцінскага. Гэта быў дзень пахавання ахвяраў падзення польскага самалёта пад Смаленскам. Беларусы ў адказ крычалі :«Дзякуй!»

сінадальнага перакладу. І ўверавалі.

А БГ ужо высмейваў павальную пабожнасць, што раптам накаціла да былых грамадзян СССР: «Ох нехило быть духовным — в голове одни кресты» (альбом «Снежный лев», 1996 г.). БГ, відаць, адзіны дзеяч нефарматнай рускай культуры, да якога ходзяць пытацца не аб творчых планах і нават не "як жыць", а "што адбываецца». Дыягназы рускаму грамадству ды ўраду ён ставіць яшчэ да таго, як сталі заўважныя першыя сімптомы. Толькі, як і належыць любому салiднаму прадказальніку, зашыфроўвае іх у туманныя вобразы і прыгожыя метафары. Самая вядомая з іх, відаць, «Поезд в огне» — песня, у якой ён сфармуляваў усеагульнае адчуванне Перабудовы.

Потым, у 1991-м, «мы въехали в тоннель, а вокруг стоит крест». Тлумачыць лёс Расіі на прыкладзе цягніка спявак працягвае дагэтуль. Калі цікава, вось прагноз на наступную пяцігодку: «поезд едет дальше, и гудок гудит снова, и все пассажиры вымазаны красным» (альбом «Лошадь белая», 2008 г.). Сам аўтар адчувае сябе ўжо па-за гэтым цягнікам грамадскіх працэсаў. І, кажа, яму ад гэтага добра.

***Трэцяя цнота БГ ў яго начытанасці, наслуханасці і вострым розуме ды бездакорным гусце, што дазваляюць інтэрпрэтаваць усё гэта***

Яго творчасць — гэта, па сутнасці, разгорнутыя цытаты з расійскай і сусветнай культуры і роздум з нагоды працытаванага. Многія з твораў БГ адкрывае для сябе год на 5 раней, чым яны даходзяць да шырокага чытача ў Расіі. Ёсць песні, якія цалкам сатканыя з адсылак да іншых аўтараў — фанаты любяць спаборнічаць, хто пазнае больш крыніц натхнення. Галоўныя з іх, гэта, відаць, руская класіка да 1917 года, заходняя літаратура, музыка, кінематограф (асобна — кнігі Дж.Р.Р. Толкіна), літаратура і філасофія Усходу, Біблія.

Сам БГ вяршыняй культурнага росквіту лічыць старажытны Кітай. І марыць пра тое, каб улада ў Расіі не мянялася як мага даўжэй. Бо культура буяе там, дзе няма войнаў ды рэвалюцый. Таму БГ за манархію. Або за такую дэмакратыю, каб улада не выходзіла з рук аднаго клану стагоддзямі. Ён цынічна звяртае ўвагу расіян на тое, што пры Пуціне і Мядзведзеве так і можа стацца. Трэцяя цнота БГ у тым, што ён няпросты.

***Чацвёртая цнота БГ у яго дасканалай іроніі***

Ніколі не ведаеш, калі ён сур'ёзна, а калі сцябецца, і на гэтым прагараюць сотні інтэрпрэтатараў усёй яго творчасці, не толькі музычнай. Грабеншчыкоў, па сутнасці, адзін са слупоў расійскага постмадэрнізму: у Расіі 1980–1990-х ён знайшоў увасабленне ў дзейнасці арт-групы «Міцькі», якой сімпатызуе БГ, і яшчэ ў кінематографе — «Асса», «Два капітана два». Сцёбны наратыў у БГ — ад вялікага Сяргея Курохіна, яго сябра, выбітнага джазавага музыкі, з якім яны стварылі шэраг супольных культурных праектаў. Шмат што ў тым, што спявае БГ, — гэта прыхаваная іронія. «Вось вы ў адной песні спяваеце: «Мама, я не могу больше пить», — а ў наступнай за ёй: «Все говорят, что пить нельзя, а я говорю, что буду», — адкуль такая супярэчлівасць?» — «Няма супярэчлівасці». — «Ну як жа няма, калі ёсць!» — не разумеюць журналісты…

БГ так усіх заблытаў, што прэса ходзіць да яго праваслаўнага духоўніка, і той усур'ёз дыктуе ў газету графік споведзі самога БГ, яго музыкаў і яго жонкі, дае справаздачу пра візіты БГ да Далай Ламы ды індуісцкіх гуру. Адным і тым жа тэкстам казаць сур'ёзна і іранізаваць — вышэйшы пілатаж сучаснай літаратуры. Чацвёртая цнота БГ у тым, каб адначасова казаць празрыста і быць шматзначным.

***Пятая цнота БГ у яго здольнасці сумнявацца***

«Я не могу принять сторону, я не знаю никого, кто неправ», — спявае ён. БГ прадукуе ацэнкі падзеяў і з'яваў, але не адчувае сябе ў праве навязваць нейкія рашэнні. Маральны кодэкс БГ вынесены з ленінградскіх 1960-х яго дзяцінства — гэта той кодэкс інтэлігента-дысідэнта, якім, так ці інакш, працягвае кіравацца эліта на постсавецкай прасторы.

У апошнія гады кодэкс гэты падмацаваўся, напоўніўся каштоўнасцямі хрысціяніна-ліберала. Менавіта праз супадзенне маральных кодэксаў, а не праз індыйскія пахошчы ці любоў да Шэкспіра слухачам у Вільні, Мінску ды Кіеве БГ па-ранейшаму духоўна блізкі.

***Шостая цнота БГ ў тым, што ён пяе пра казу***

Каза ў яго апошнім часам — увогуле цэнтральны сімвал, нейкі зааморфны сінонім рускай душы, камічны і лірычны адначасова. Найлепей гэта было выслаўлена ў песні «О смысле всего сущего» з альбому «Беспечный русский бродяга» (2006 г.):

*Человеческая жизнь имеет*
*более одного аспекта.*
*В городе Таганроге есть*
*два Звездных проспекта.*
*На одном — небеса сияющие*
*И до самого Волго-Дона*
*Возвышаются сияющие*
*Дворцы из шлакобетона.*
*И по нему каждую пятницу,*
*Как выйдут со смены из шахты,*
*Маршируют белозубые*
*Космонавты.*

*А на другом все дома*
*в полтора этажа*
*И по истоптанной траве*
*гуляет коза,*
*День проходит и два проходит,*
*Веревка перетерлась,*
*но коза не уходит;*
*Ей совершенно некуда идти,*
*Она смотрит в небеса и шепчет:*
*«Господи, прости!».*

Пяшчота да Расіі ў паўтары паверхі, да маленькіх гарадкоў, да простых людзей прасякае ўсё, што робіць БГ, пачынаючы з 1991 года. Шостая цнота БГ у тым, што ён пяе не пра «священную нашу державу», а пра тую пастаральную Расію, з якой мы тут, у Беларусі, Літве ці Украіне выбіраем сабе межаваць, сябраваць, братацца.

***І, нарэшце, сёмая цнота БГ у тым, што ўсё, што ён ні піша, яно, па вялікім рахунку, пра Каханне***

Я думаю, нават без уліку папярэдніх шасці цнотаў, толькі за гэту адну яго і слухаюць.

# «ЯНЫ МАЮЦЬ РАЦЫЮ: Я НЕНАРМАЛЬНЫ»

## БГ ПРА СЯБЕ І НАВАКОЛЬНЫ СВЕТ



### Пра любімы напой

Вада. Цяпер мне зусім не цікава піць алкаголь. Я занадта шмат усяго добрага выпіў, і сёння ў мяне няма цягі да спіртнога. Цвярозым мне быць значна цікавей.

### Пра бараду

Мая барада мае для мяне (смяецца) глыбока містычны сэнс. Мне падабаецца быць старэйшынам, бо старэйшына — гэта як у афрыканскай вёсцы старэйшына. Гэта званне, якое ні да чаго не абавязвае, але пры гэтым дае поўную свабоду дзеянняў.

### Пра спрэчкі з жонкай

Часам у нас бываюць рознагалоссі наконт тлумачэння святых тэкстаў.

### Пра свой узрост

Чым старэй я раблюся, тым больш кайфую.

### Пра натхненне

З тых часоў, як музыка стала бізнесам, натхненне сышло. Гэта маё асабістае адчуванне. Тыя, хто працягвае пісаць, робяць гэта ўжо не так цікава, як тады. А ў пачаткоўцаў няма такой сілы волі, каб не заўважаць спакусы грошай.

### Пра грошы

У грошах няма нічога празаічнага, грошы — вельмі паэтычная рэч, калі іх правільна ўспрымаць. У любым цывілізаваным грамадстве такі калектыў, як «Акварыум», меў бы значна больш грошай, чым можна выдаткаваць. Паколькі ў нас сістэма працуе па-іншаму і нам дагэтуль даводзіцца граць канцэрты, каб зарабляць на ежу, мы прымаем любую дапамогу.

### Пра творчы рост

Каб дасягнуць чагосьці ў любой сферы, трэба перастаць арыентавацца на тое, што побач з табой, і трымаць курс на вышэйшыя сусветныя дасягненні. А мы ўвесь час глядзім на тое, што робіць сусед. І на фоне сваёй вёскі ты быццам бы выдатны музыка. А калі параўноўваеш сябе з Джымі Хендрыксам, атрымліваецца, што ты ну не вельмі добры гітарыст. Так што, калі жадаеш навучыцца граць на гітары, вучыся ў Джымі Хендрыкса.

### Пра людзей, якія лічаць, што БГ ненармальны

Яны маюць рацыю: я ненармальны. Я і не жадаю, ніколі ў жыцці не жадаў быць звычайным. Мне заўсёды здавалася, што быць звычайным вельмі сумна. Досвед пацвярджае. Тыя мае аднагодкі, якія былі звычайнымі, вельмі нудзяцца.

### Пра моладзь

Дзе праходзіць мяжа паміж мной і моладдзю? Я ведаю людзей, якім 98, і яны лічаць 80-гадовых моладдзю… Мне цікава размаўляць з усімі людзьмі, якія не толькі могуць варушыць языком і вуснамі, але яшчэ ім ёсць што сказаць. І яшчэ яны здольныя пачуць. Калі чалавек чуе, з ім цікава размаўляць.

### Пра інтэлігенцыю

Наколькі я памятаю, вялікую частку XX стагоддзя слова «інтэлігенцыя» было лаянкавым. Гэта той малалікі, па шчасці, пласт людзей, якім неўладкаванасць сексуальнага жыцця не дазваляе ўспрымаць гармонію Сусвету.

### Пра рэвалюцыю

Любая рэвалюцыя — гэта тэрміновая неабходнасць нейкай кампаніі людзей зарабіць шмат грошай. Я цынічны чалавек, я ведаю, як гэта робіцца.

### Пра палітыку

Мама распавядала, што ў дзяцінстве я напісаў ліст Хрушчову — хацеў даць некалькі парадаў. З тых часоў мяне палітыка больш не цікавіла.

### Пра тэлебачанне

На працягу апошніх 6–7 гадоў у мяне не наладжаны ніводзін «савецкі» канал. Калі мне захочацца запэцкацца ў брудзе, я магу выйсці з хаты і паваліцца ў першую-лепшую лужыну. (…) Гляджу добрыя фільмы, напрыклад Іаселіяні. Канал «Discovery» паказвае выдатныя жывёл. Мая таямніца ў тым, што «рэчаіснасць», якую нам паказваюць па тэлебачанні, мяне ніколі асабліва не цікавіла. Гэта, напэўна, і выратавала.

### Пра колеры

Аранжавы колер — гэта колер, які трэба насіць па чацвяргах. Мяне адзін святар у крышнаіцкім храме ў далёкім індыйскім горадзе навучыў: трэба кожны дзень тыдня насіць розныя колеры, што робіць спрыяльным гэты дзень для чалавека. Магу распавесці адразу: у нядзелю носяць чырвоны колер, у панядзелак — ружовы, у аўторак — жоўты, у сераду — зялёны, у чацвер — аранжавы, у пятніцу — белы, а ў суботу — сіні. Тады зоркі будуць вам спрыяць.

### Пра Гоа

У Гоа няма чаго рабіць. Там ужо руская мафія. Дарэчы, майце на ўвазе, у Гоа руская мафія ўжо пачынае забіваць сабе хаты, гэта значыць арандаваць іх у мясцовых, а потым здаваць за значна вышэйшы кошт рускім. У Гоа ездзіць не трэба, ёсць маса значна больш добрых і значна меней населеных месцаў.

### Пра Хрыста

У Хрысце важная яго любоў, якая з намі дагэтуль. І любы чалавек, які ўваходзіць у царкву з разуменнем гэтага, змяняе сваё стаўленне да веры. Калі молішся, то адчуваеш: Хрыстос існуе. Дарэчы, некаторыя гісторыю пра Хрыста будуюць толькі на яго цудах. Маё жыццё цуды да лепшага не змяняюць. А калі я малюся перад абразамі, гэта змяняе маё жыццё да лепшага.

### Пра Петрарку

Калі выйсці цяпер на вуліцу ў горадзе Растове і прачытаць каму-небудзь санеты Петраркі, цябе нават не паб'юць. Яны, безумоўна, страцілі сваю забойную сілу ў перакладзе і з цягам часу. Культура павінна перавынаходзіць сябе. Два разы адно і тое ж аднымі і тымі ж словамі казаць бессэнсоўна.

### Пра Баха

— Ёган Себасцьян Бах ваш любімы кампазітар?

— Ну адзін з любімых, скажам так.

— Вы б узялі яго клавішнікам у «Акварыум»?

— Барані Божа, я б не стаў псаваць яму кар'еры.

**Паводле www.peoples.ru**

▸ АГЛЯД

# ТРЫ ВЫСТАВЫ Ў ПАЛАЦЫ МАСТАЦТВАЎ

Аляксей ХАДЫКА

**У экспазіцыйных залах на Казлова, 3, як апошнім часам павялося, экспануюцца адначасова тры выставы, гарантуючы візіцёрам беспамылковую разнастайнасць і магчымасць выбару. Усе яны дзейнічаюць з 15 па 25 красавіка.**


Ігар Рымашэўскі. «Кэтцюр’е»


Мікалай Рыжыкаў. З Непальскага цыклу.

Пачнём з далёкай залы першага паверху, экспазіцыі «Двое ў горадзе» Людмілы Шчамялёвай і Ігара Рымашэўскага. Гэта мастакі, якіх заўсёды хочацца назваць маладымі (што не перашкаджае нашай газеце, не хаваючы таямніцы, бо яе не хаваюць і анонсы выставы, павіншаваць Людмілу з досыць круглым юбілеем, што наступіць 25 красавіка).

Абодва творцы — навучэнцы Мінскага мастацкага вучылішча (1975–1979), пасля якога Ігар дапоўніў сваю мастацкую адукацыю яшчэ ў Беларускай мастацкай акадэміі. Яны ўдзельнічаюць у выставачным працэсе з пачатку 1980-х, а з 2003 года выстаўляюцца разам. Прычына простая — блізкасць творчых інтарэсаў дапоўніўся тым, што зараз Людміла і Ігар — муж і жонка. І незвычайным чынам гэтыя абставіны надаюць работам на выставе своеасаблівую чалавечую цеплыню і абаяльнасць.

Памятаеце выдатнае палатно Васіля Сумарава «Мой дом» (1973), дзе жыццё шараговых меннчукоў у простым доме зрабілася тэмай для светлага, паэтычнага, узнёслага прачытання, штодзённасць, напоўненая замілаваннем — спосабам надаць звычайнасці паэтычную форму? Шчамялёва і Рымашэўскі ў пэўным сэнсе робяць падобнае, засяроджваючыся на простых рэчах і з’явах, што абкружаюць і насяляюць «мой дом». Часам форма лубка, яскравы сонечны колер, як словы дасціпнага добрага жарту, дапамагаюць праектаваць на звыклыя рэчы і вяртаць назад гледачу аптымістычны, усмешлівы настрой. Ці гэта адбітак вясёлага красавіцкага сонца ў сюжэтных тэмах, народжаных гарадскім фальклорам?

Адным словам, калі лубкі Цэслера — іранічныя, то лубкі Шчамялёвай-Рымашэўскага — вясёлыя. Часта прысутныя на іх паўказачныя хатнія каты і сабакі — як талісманы, якія гарантуюць станоўчыя эмоцыі.

Вялікая тэматычная выстава «Краявід–2010» займае ўвесь верхні паверх Палаца. Каля паўсотні прац розных мастакоў — падобны фармат заўсёды выклікае боязь убачыць занадта рознастылёвыя работы, якія не знітоўвае адзінства задумы і стылістыкі паказу, чым, скажам, выйгрышна вылучаецца анансаваная ў пазамінулым нумары “НЧ” французская выстава «Нармандыя ў жывапісе». Ды і дзе ў краявідах Беларусі тое мора, сонца, вецер узбярэжжа, як у Францыі? Але краявід на тое і ўлюбёны шараговымі калекцыянерамі жанр, што можа быць і манументальным, і камерным, і меладычным, і абстрактна-дэкаратыўным, увасабляць рорныя настроі — зямлі, неба, прыроды, душы. І маюць абсалютную рацыю арганізатары выставы, калі прыгадваюць, што традыцыі беларускага пейзажнага жывапісу ўжо 200 гадоў, і ганарыцца яна такімі імёнамі, як Іван Хруцкі, Апалінарый і Іпаліт Гараўскія, Фердынанд Рушчыц, Вітольд Бялыніцкі-Біруля, Станіслаў Жукоўскі.

Не, іх работ у Палацы мастацтваў няма, але тыпалогія падыходу да выканання кампазіцый, стылістыка работ — самая разнастайная, на любы густ. І што прыемна адзначыць, ёсць дастаткова багата невыпадковых твораў мастакоў сучасных пакаленняў — ад старэйшага да маладых. Каляровая вытанчанасць Алега Скавародкі, шчыры акадэмізм Паўла Масленікава, габеленавая абстракцыя фарбаў Віктара Шылко, ззянне яскравых колеравых плям Міколы Бушчыка, нечакана камерная лірычнасць Андрэя Смаляка — выбар не дазваляе засумаваць.

Тым больш што на першым паверсе Палаца мастацтваў наведвальніка чакае яшчэ адна экспазіцыя — персанальная выстава графікі «Ваколіца. Ад Палесся да Гімалаеў» Мікалая Рыжыкава. 70-гадовы мастак, старшыня творчага аб’яднання «Верасень» — прадстаўнік пакалення шасцідзесятнікаў, выпускнік Тэатральна-мастацкага інстытута 1967 года, дзе ён вучыўся ў Аляксандры Паслядовіч, Мая Данцыга, Уладзіміра Стэльмашонка. Вядомы таксама як жывапісец і мастак кніжнай графікі, гэтым разам Мікалай Максімавіч прадстаўляе сваю станкавую графіку, у якой найбольш яскрава адбіўся манументальна-напружаны стыль, які па-ранейшаму звязвае яго творчы метад з перадавымі пошукамі мастакоў часоў «адлігі», часоў яго творчай маладосці.

Аловак, сангіна, вугаль — ва ўсіх тэхніках дамінуе моцны, шырокі штрых, дакладна вызначаная форма — як узор добрай школы для маладых графікаў. Подых апошніх гадоў — большая ўвага тэмам нацыянальнай спадчыны — гэта цыкл «Стары парк Чартарыйскіх» (2009), аркуш «Дзяды ў Дуніна-Марцінкевіча». А замалёўкі з Непалу, Славакіі, Маўрытаніі адметныя асаблівым духам гэтых розных краёў.

▸ ВЫСТАВА

# ПАЭТ РЭПАРТАЖУ Ў МІНСКУ

Вольга ХВОІН

**«Я заўсёды шукаў мой дом, шукаў Пінск, — у Афрыцы, у Азіі, у Лацінскай Амерыцы», — так пісаў пра сваю малую радзіму выдатны дзеяч еўрапейскай культуры, журналіст і пісьменнік Рышард Капусцінскі.**





Выстава «Паэт рэпартажу. Рышард Капусцінскі» адкрылася ў Нацыянальным гістарычным музеі сумесна з Польскім інстытутам у Мінску. Дакументы, фатаграфіі, газетныя публікацыі, кнігі — сціслы аповед пра асобу Капусцінскага.

У Польшчы Капусцінскага называлі «каралём рэпартажу», і ў 1995 годзе па апытанні, праведзенаму сярод палякаў, ён быў прызнаны найвялікшым журналістам свету. Знакаміты выхадзец з Беларусі атрымаў сорак розных прэмій і ўзнагарод, вылучаўся на Нобелеўскую прэмію, аб’ездзіў ледзь не ўвесь свет, але захаваў у сваім сэрцы прыязнасць да Беларусі і Пінска — месца, дзе нарадзіўся і жыў да 1942 года.

«Памятаю, як Рышард рыхтаваўся да свайго першага прыезду ў Пінск ужо ў сорак год. Толькі ў 1979 годзе ён атрымаў магчымасць прыехаць пасля шматлікіх спробаў. Ён быў як у трансе. Я дапамагала яму і заўважыла: «Да ніводнага падарожжа ты так не рыхтаваўся, хаця аб’ездзіў паўсвету». «Але ж я еду да Пінска!» — адказаў ён. І тое ўсё тлумачыла, — расказвала на адкрыцці экспазіцыі жонка Рышарда Капусцінскага Аліцыя. — У Рышарда быў намер напісаць кнігу пра яго родныя краі, ён збіраў матэрыялы, карэспандэнцыю, фотаальбомы... Але не паспеў, не змог пабачыць і выдання сваіх кніг, перакладзеных на беларускую мову. Яны з’явіліся пасля яго смерці, і гэта найлепшая памяць пра яго, яго захапленне, якім было пісанне».

У перакладзе на беларускую мову выйшлі кнігі «Імперыя», «Падарожжа з Герадотам», выбраная лірыка. Рэдактарка твораў Бажэна Дудка выказала спадзяванне, што выстава заахвоціць выдаўцоў перакласці на беларускую мову іншыя кнігі пісьменніка, а яго літаратурная спадчына насамрэч багатая — больш за два дзесяткі кніг. Намеснік міністра культуры Беларусі Тадэвуш Стружэцкі назваў Капусцінскага «знакамітым выхадцам з Беларусі, які захаваў любоў да яе, уславіў не толькі польскую журналістыку і літаратуру, але ўвайшоў у сусветную культуру. Гэта прыклад таго, як выхадцы з Беларусі ўзбагачалі сусветную спадчыну». Аднак жа цікавы факт, што пінскія газеты ў свой час адмовіліся друкаваць частку кнігі «Імперыя», дзе апавядаецца пра Пінск, калі Яўген Салейчук пераклаў яе на беларускую мову.

Не так даўно ў Польшчы разгарэўся скандал, звязаны з імем Рышарда Капусцінскага. Выцвам бы журналіст працягла час супрацоўнічаў з разведслужбамі Савецкага Саюза, а яго рэпартажы мелі недакладнасці і мастацкую прыдумку. Цяпер праверкай гэтых звестак займаецца польскі Інстытут нацыянальнай памяці. Але ў любым разе Капусцінскі дагэтуль уважаецца ў Польшчы за ікону рэпарцёрскага стылю, таленавітага і мужнага журналіста свайго часу.

У Беларусі пра асобу Капусцінскага вядома нямнога, таму выстава можа быць цікавай для тых, хто хоча адкрыць для сябе новае імя ў шэрагу выбітных выхадцаў з нашай краіны. Падрыхтаваная яна была спецыяльна для Мінска, матэрыялы перакладзеныя на рускую і беларускую мовы. Экспазіцыя працуе ў Нацыянальным гістарычным музеі да 9 мая, з 27 мая па 27 чэрвеня яна будзе дэманстравацца ў Пінску ў Музеі беларускага Палесся.

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.
ЗАСНАВАЛЬНІК: Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
ВЫДАВЕЦ: Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.
АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org
НАДРУКАВАНА ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 360
Падпісана да друку 23.04.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.